№ 19 (569) 22 траўня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Зброя для тэрарыстаў

Інтэрпол пацьвердзіў аўтэнтычнасьць дадзеных з ноўтбукаў FARC.

Старонка 8

## Дзьве з паловай тысячы жыцьцяў у слоіках

Памёрла Ірэна Сэндлерова — полька, якая ў вайну выратавала 2500 габрэйскіх дзяцей.

Старонка 2

## Алег Хаменка

Якая нам карысьць ад «Эўрабачаньня»?

Старонка 12

### У НУМАРЫ

**Выбары — 2008: Хто па якой акрузе ідзе?**

Кааліцыя апазыцыйных партый хоча ўдзельнічаць у выбарах і робіць стаўку на тэму кантролю за ўладай. **Старонка 3.**

**Абое рабое**

Канфрантацыйная замежная палітыка Крамлю вынікае з аднадушнай волі як расейскай эліты, так і шырокіх пластоў насельніцтва, і няма падставаў спадзявацца на яе перамену пасьля прыходу Мядзьведзева. Піша Іван Красьцеў. **Старонка 6.**

**У падпольлі можна стрэць ня толькі пацукоў**

На такія спэктаклі ходзіш з унутраным трымценьнем — баючыся расчаравацца. Аднак расчараваньне не прыйшло. Пра «Дзікае паляваньне караля Стаха» ў Купалаўскім піша Аляксандар Фядута. **Старонка 11.**

**За кіроўцу вырашыць электроніка**

Эўракамісія абавяжа вытворцаў аўто забясьпечваць усе легкавікі электроннай сыстэмай стабілізацыі руху. **Старонка 5.**

**Ярмошына адпачывае ў Эгіпце**

Старшыня Цэнтравыбаркаму ўзяла кароткачасовы адпачынак і цяпер знаходзіцца ў Эгіпце. **Старонка 14.**

# Пачаўся вялікі распродаж

Канцэрн «Белнафтахім» мае падаць прапановы па прыватызацыі нафтахімічных прадпрыемстваў «Палімір» і «Нафтан». Адначасова Алег Дзерыпаска абмеркаваў з А.Лукашэнкам акцыянаваньне МАЗу. **Старонка 5.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Тактыка кроплі

Аляксандар Мілінкевіч упарта працягвае езьдзіць па краіне. У Салігорск разам зь Мілінкевічам накіраваўся карэспандэнт «НН».

Прыкладна а 11 гадзіне мікрааўтобус Мілінкевіча, той самы, на якім рабіліся ўсе перадвыбарныя паездкі ў 2006-м, выехаў зь Менску ў бок Салігорску і Слуцку. Кіроўца бусіка Міша замацаваў на заднім шкле вялікі бел-чырвона-белы сьцяг, меншы штандар паставіў сьпераду. Міша кажа, што зрабіў гэта, хутчэй, не для сябе. «Вось сёньня мой мікрык убачыла некалькі соцень чалавек. Нехта ўбачыць такое і таксама асьмеліцца езьдзіць з такім сьцяжком», — кажа кіроўца.

Разам зь Мілінкевічам у паездку накіраваліся ягоныя нязьменныя спадарожнікі Людміла Гразнова і Аляксей Кавалец. У вялікай ступені менавіта дзякуючы стараньням Кавальца і Юрася Губарэвіча і адбываюцца падобныя сустрэчы ў рэгіёнах. Асноўны цяжар арганізацыі кладзецца на іхныя плечы.

Па дарозе Мілінкевіч расказвае пра ўчорашнія сустрэчы ў Смалявічах і Лагойску. Напрыклад, у Смалявічах падчас размовы зь людзьмі на мясцовым рынку міліцыянты вялі сябе вельмі карэктна. Пасьля сустрэчы яны нават атрымалі падзяку за тое, што не перашкаджалі. Адзін з байцоў пацiснуў на гэта плячыма: «Ну, вы ж не парушалі грамадзкага парадку». Затое арыштаванай машына палітыка аказалася ўжо па дарозе ў Лагойск. Мілінкевічу давялося дабірацца да гораду на выпадковых машынах, якія атрымлівалася лавіць на трасе. «Нічога, бывала і горай, — усьміхаецца лідэр «Руху «За Свабоду». — У Кобрыне аднойчы нават давялося пешшу ўвайсьці ў горад».

Аляксей Кавалец расказвае, што да апошняга будзе дамагацца рэгістрацыі «Руху «За Свабоду». На гэты раз Мін'юст нават указала на ўсе недакладнасьці, якія трэба выправіць у статутных дакумэнтах. «Адмовяць і на гэты раз, зноў будзем падаваць», — кажа А.Кавалец. Мілінкевіч, паказваючы на свайго паплечніка, зноў усьміхаецца: «З палешуком у камандзе дакладна не прападзеш».

**Працяг на старонцы 7.**

### ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Прэзэнтацыя кнігі Марыі Мартысевіч

**27 траўня, у аўторак, а 18.00 у Пушкінскай бібліятэцы (вул.Гікалы, 4)** пройдзе прэзэнтацыя кнігі Марыі Мартысевіч «Цмокі лятуць на нераст». Удзел бяруць: паэт Андрэй Хадановіч, эсэіст Ігар Бабкоў, цмок Мікола Шакель. Філёзаф Валянцін Акудовіч удзелу ў прэзэнтацыі браць ня будзе. Уваход вольны.

# Дзьве з паловай тысячы жыцьцяў у слоіках



Памерла **Ірэна Сэндлерова**. У вайну гэтая полька, маючы на руках уласнае дзіцё, рызыкуючы жыцьцём, разам зь сябрамі выратавала 2500 габрэйскіх дзяцей.

Ірэне Сэндлеровай у 1942-м было 32 гады. У яе на руках была маленькая дачка. Муж у 1939-м зьнік недзе ў савецкіх турмах. Яе прафэсія — настаўніца польскай мовы — пад акупацыяй нікому не была патрэбнаю. Яна пайшла працаваць мэдсястрой. Сябры-каталікі з Польскай сацыялістычнай партыі ўцягнулі яе ў падпольную дзейнасьць. Ад восені 1943-га Сэндлерова кіравала дзіцячай сэкцыяй у таемнай Радзе дапамогі жыдам «Жэгота» — за назву групы яны выбралі імя пэрсанажа Міцкевічавых «Дзядоў».

### У адзеньні мэдсястры вывозіла дзяцей

Калі падпольлю стала вядома пра рашэньне немцаў ліквідаваць гета, яны вырашылі распачаць акцыю па вывазе адтуль дзетак ды разьмяшчэньні іх у польскіх сем’ях, прытулках і манастырах.

За любую дапамогу габрэям пагражала сьмяротнае пакараньне. Гэта не спыняла моладзь з «Жэготы». Мэдсястра Ірэна праяжджала мэдыцынскім транспартам на тэрыторыю гета.

Дзецям давалі снатворнае, загортвалі іх у тканіну ці клалі ў скрынкі і перавозілі на «арыйскі» бок. Гестапаўцам на браме паведамлялі, што гэта трупы памерлых ад тыфу — у гета ад скучанасьці і голаду лютавалі эпідэміі. Усяго такім чынам удалося вывезьці каля 2500 дзяцей. Спачатку яны трапілялі ў хаты актывістаў «Жэготы», пасьля разьяжджаліся ў прыёмныя сем’і. Якую сьмеласьць трэ было мець гэтым тысячам падпольшчыкаў, каб ратаваць не сваіх — чужых.

Зьвесткі пра дзяцей Ірэна зашыфроўвала і закопвала ў слоіках у сваім гародзе, каб сем’і маглі злучыцца пасьля вайны. Усе яны захаваліся! На жаль, бацькі ўратаваных амаль усе загінулі, але, прынамсі, захаваліся сапраўдныя імёны дзяцей.

Вядома ж, суседзі ўсё тое бачылі. Ніхто не данёс.

У 1943 годзе Ірэну Сэндлерову арыштавала гестапа. Яе катавалі. Перабілі ногі і ступакі, выбіваючы прызнаньні. Яна ня выдала ні адрасу, не сказала ні слова. Яе асудзілі на сьмерць. У апошні момант сябрам з «Жэготы» ўдалося падкупіць ахоўнікаў, і Сэндлерова пазьбегла расстрэлу.

Усё ў гэтай гісторыі падобна да цуду, цуду сярод канца сьвету, якім была Варшава ў 1944 годзе. Турма не зламіла Сэндлеровай, яна нароўні з астатнімі змагалася ў адчайным Варшаўскім паўстаньні.

Пасьля 1945 году падсавецкія ўлады забаранілі Сэндлеровай як пэпээсаўцы працаваць настаўніцай, і яна да канца жыцьця шчыравала ў ахове здароўя.

У 1965 годзе інстытут «Яд ва-Шэм» надаў ёй званьне Праведніцы сярод народаў сьвету, а ў 1991 годзе яна стала ганаровай грамадзянкай Ізраілю.

### Нобэль яе не знайшоў

У 2006 яна была намінаваная на Нобэлеўскую прэмію міру. Калі хто і быў варты той прэміі, то гэта яна. Нягледзячы на падтрымчыя высілкі польскага прэзыдэнта Леха Качыньскага й прэм’ера Ізраілю Эхуда Ольмэрта, камітэт выбраў Ала Гора.

Сэндлерова пражыла 98 гадоў.

Сама яна казала, што ў вайну ёю рухала перадусім пачуцьцё справядлівасьці, як хрысьціянскія перакананьні.

«Хто ўратаваў адно жыцьцё, той уратаваў цэлы сьвет», — кажа Талмуд. Сэндлерова ўратавала 2500 сусьветаў.

Кажуць, за апошняе дзесяцігодзьдзе Сэндлерова выбухнула абурэньнем толькі аднойчы. Яе наведвала дэлегацыя амэрыканскіх настаўнікаў гісторыі, і адзін зь іх спытаўся: «А чаму вы не нанялі сабе талковага адваката, калі апынуліся ў турме?»

**АТ, МБ**

## НАПІШЫ ПАЛІТВЯЗЬНЮ

Яму цяпер цяжка. Твой ліст можа выратаваць яго

**Сяргей Парсюкевіч**

222160, Менская вобласьць, Жодзіна, вул.Савецкая 22–А, турма №8, Камэра № 169

## СЬЦІСЛА

### Мінадукацыі вяртае ў ВНУ беларускую мову

Міністэрства адукацыі рэкамэндавала ў новым навучальным годзе ва ўсіх ВНУ краіны арганізаваць выкладаньне абавязковага курсу прафэсійнай лексыкі беларускай мовы. Пра гэта гаворыцца ў лісьце намесьніка міністра адукацыі Казіміра Фарыны, накіраваным у ТБМ. Алег Трусаў ад імя ТБМ выказаў падзяку кіраўніцтву Мінадукацыі.

### 23 траўня перакрыюць рух на праспэкце

Гэта адбудзецца дзеля Рады кіраўнікоў урадаў СНД. Абмежаваньні будуць уведзены на аўтадарозе «Менск—Аэрапорт » з 9.00 да 11.30; на праспэкце з 11.00 да 12.00; на праспэкце ад Філімонава да аэрапорту «Менск-2» з 16.00 да 19.00.

### Кіма перавялі ў Бабруйск

Пра гэта nn.by паведаміла маці палітвязьня, Тацяна Кім. Яна даведалася пра гэта, калі прынесла сыну перадачу ў СІЗА на Валадарскага. 22-гадовы сын эмігрантаў з Узбэкістану Андрэй Кім асуджаны да 1,5 году калёніі агульнага рэжыму за ўдзел у маніфэстацыі апазыцыі 21 студзеня. Ён быў прызнаны вінаватым у зьбіцьці супрацоўніка ДАІ.

### Праект дэкрэту аб адукацыі

Падрыхтаваны праект дэкрэту прэзыдэнта пра асобныя пытаньні сярэдняй адукацыі. Пра гэта заявіў намесьнік кіраўніка прэзыдэнтуры Анатоль Рубінаў. Камісія лічыць мэтазгодным вярнуцца да 11-годкі і ўнівэрсальных праграмаў. Навучальны тыдзень ва ўсіх установах будзе пяцідзённы. Мяркуецца захаваць гімназічныя і ліцэйскія клясы, а таксама клясы з эстэтычным ухілам (музычным, мастацкім, харэаграфічным) і спартовым. Застаецца і дзесяцібальная сыстэма, і цэнтралізаванае тэставаньне.

### Прэзэнтавалі «Магдэбурскую Горадню»

Сьвет пабачыла першая кніга з сэрыі «Гарадзенская бібліятэка» — манаграфія гісторыка Юр’я Гардзеева з Кракаўскага ўнівэрсытэту «Магдэбурская Горадня». Манаграфія расказвае пра сацыяльную тапаграфію й маёмасныя адносіны ў XVI-XVIII стагодзьдзях у Горадні.

**МБ; ЯС**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Дзе Вы мяркуеце адпачываць гэтым летам?**

| | |
|---|---|
| На Балтыцы | 53 (15.0%) |
| На Міжземным моры | 39 (11.0%) |
| На Чорным (Азоўскім) моры | 52 (14.7%) |
| Паеду кудысь на экскурсію | 52 (14.7%) |
| На азёрах | 43 (12.1%) |
| Проста ў вёсцы | 79 (22.3%) |
| Не адпачываю прынцыпова | 36 (10.2%) |

Усяго прагаласавала: 354

**Цэлае лета — падарожжы з «Нашай Нівай». Гэтым разам не фэльетон, а падарожныя нататкі Лёліка Ушкіна. Ажно ў Бразылію занесла яго — старонка 9.**

## Шарапава прыедзе ў Беларусь паслом



Пасол добрай волі ААН расійская тэнісістка Марыя Шарапава наведае раёны Беларусі, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Шарапава наведае тыя раёны, на рэабілітацыю якіх яна раней ахвяравала 130 тыс. даляраў. Шарапава - першая ракетка сьвету. Яна нарадзілася 19 красавіка 1987 г. у сібірскім гарадку Нягань, куды ейныя бацькі пераехалі з Гомеля, ратуючыся ад Чарнобылю.

# Выбары — 2008: Хто па якой акрузе ідзе?

Многа няяснага застаецца вакол удзелу апазыцыі ў выбарах у палату прадстаўнікоў. Напрыклад, «Малады фронт» як арганізацыя абвясьціла пра байкот парлямэнцкіх выбараў. Але вылучаныя па квоце МФ Дзяніс Садоўскі і Віктар Янчурэвіч (абодва — Менск) і Зьміцер Кухлей (Масты, Гарадзеншчына) — маюць намер узяць удзел у выбарах як незалежныя кандыдаты. І не зразумееш, ці то гэта байкот, ці то гэта ўдзел.

Лідэр АГП Анатоль Лябедзька, паколькі «МФ»афіцыйна ня ідзе на выбары, прапанаваў запоўніць гэтыя вакансіі ў сьпісе АДС вядомым у краіне палітыкам — Аляксандру Мілінкевічу, Станіславу Шушкевічу, Аляксандру Ярашуку ці некаму яшчэ, хто пакуль ня выказаўся аб сваім удзеле ў выбарах.

Хто з апазыцыянэраў ідзе на выбары па якой акрузе?

Найбольшая колькасьць апазыцыйных лідэраў назіраецца, што і ня дзіўна, у Менску. Так, лідэр АГП Анатоль Лябедзька зьбіраецца балятавацца ў Сухараўскай выбарчай акрузе. На гэта свой погляд мае сябар «Руху «За Свабоду» палітоляг Алесь Лагвінец, які прапанаваў Лябедзьку правесьці «праймэрыз» па гэтай акрузе, пераможца якога і будзе прадстаўляць апазыцыю на выбарах. У сваю чаргу, Лябедзька лічыць, што «праймэрыз» не адлюстроўваюць усяго спэктару думак выбарцаў, і прапануе сацыялягічнае дасьледаваньне. Пакуль пытаньне так і ня вырашылася.

Лідэр ПКБ Сяргей Калякін будзе спрабаваць дастаць дэпутацкі мандат у Коласаўскай акрузе. Былы старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка — ва Ўсходняй. Супернік Вячоркі на апошнім зьездзе БНФ Алесь Міхалевіч зьбіраецца агітаваць за сябе выбарцаў Уручча. Увогуле, БНФ лідэр па сваіх вылучэнцах у Менску. Ад партыі па сталічных акругах таксама ідуць Аляксей Янукевіч (Аўтазаводзкая), Сяргей Карповіч (Кастрычніцкая), Юры Карэтнікаў (Паўднёва-Заходняя), Валянціна Сьвяцкая (Ясенінская).

Пяць чалавек у Менску будуць прадстаўляць АГП. Апроч ужо названага Анатоля Лябедзькі, гэта былы старшыня Нацбанку Беларусі Станіслаў Багданкевіч (Чкалаўская), Аляксандар Дабравольскі (Сьвіслацкая), а таксама дзьве жанчыны — Валянціна Палевікова (Купалаўская), Людміла Гразнова (Партызанская).

Старшыня зьліквідаванай летась Партыі жанчын «Надзея» Алена Яськова пойдзе ў Серабранцы, а лідэр яшчэ адной зьліквідаванай партыі — Працы — Аляксандар Бухвостаў будзе вылучацца ў Шабанах.

Адзіную вакансію ад БХД заняў у Старавіленскай акрузе Віталь Рымашэўскі. Былы адвакат Аляксандра Казуліна Ігар Рынкевіч забіў за сабой Пушкінскую акругу. Пойдзе на выбары і старэйшая дачка палітвязьня і экс-кандыдата ў прэзыдэнты Вольга Казуліна, яна зьбіраецца балятавацца ў Фрунзэнскай акрузе.

У Берасьці будзе балятавацца выканаўца абавязкаў старшыні БСДП Анатоль Ляўковіч, ён доўгі час жыў і працаваў акурат у горадзе над Бугам. Дарэчы, Берасьце за сабой амаль цалкам пакінулі сацыял-дэмакраты. Па другой гарадзкой акрузе на выбары ад апазыцыі ідзе Ігар Маслоўскі. Канчаючы тэму БСДП, адзначым, што ў Івацэвічах будзе балятавацца намесьнік старшыні партыі Іван Анташкевіч, а па Белавескай акрузе — Валянцін Лазарэнка.

Апазыцыйныя камуністы пакінулі за сабой на Берасьцейшчыне адну з Баранавіцкіх акруг, Мухавецкую, Пінскую і Сталінскую. Па Пінскай вясковай акрузе ў сьпісах кандыдатаў значыцца Андрэй Сухаверхі з БНФ. Намесьнік старшыні гэтай самай партыі Юрась Губарэвіч паспрабуе прабіцца ў палату ў родным Белаазёрску, дзе ўжо некалі быў дэпутатам мясцовага савету.

Пра жаданьне ўдзелу ў выбарах заявілі шэсьць прадпрымальнікаў — Мікалай Чарнавус (Баранавічы), Ірына Яскевіч (Віцебская Чкалаўская акруга), Алена Мядзьведзева (Бабруйская Ленінская), Аляксандар Цацура (Салігорск), Віктар Крываль (Стоўпцы), Віктар Гарбачоў (Барысаўская гарадзкая).

Найхутчэй, што па Барысаўскай вясковай акрузе пойдзе Сяргей Салаш. У Вялейцы і Мядзелі вылучацца будзе старшыня абласной арганізацыі Партыі БНФ Зьміцер Вінаградаў. Прыхільнік беларуска-расейскай інтэграцыі генэрал Валеры Фралоў пойдзе на выбары ў Слуцку. Пэўна, гэта зьвязана з тым, што ў горадзе БНРаўскага паўстаньня ў свой час асадзілі шмат вайскоўцаў, якія могуць падтрымаць генэрала.

Тацяна Ваніна (Партыя працы) ідзе па Койданаўскай акрузе, былы ліквідатар Чарнобыльскай катастрофы Аляксандар Валчанін (АГП) — у Жодзіна, лідэр «Маладых дэмакратаў» Аляксандар Шумкевіч — у Маладэчна, Людміла Насановіч («Надзея») — у Салігорску.

Рэдактар недзяржаўнай газэты «Вольны горад» Сяргей Няроўны балятуецца ў родным Крычаве. Былы настаўнік гісторыі з Бабруйску Алесь Чыгір адзіны, хто будзе прадстаўляць на выбарах «Рух «За Свабоду».

Андрэй Юркоў з Партыі БНФ зьбіраецца балятавацца ў Горацкім раёне, дзе хочуць пабудаваць беларускую АЭС.

Чатыры гарадзенскія акругі папалам падзялілі сябры АГП (Яраслаў Раманчук зь Віктарам Падчаненкавым) і БНФ (Вадзім Саранчукоў зь Сяргеем Антусевічам).

На Радзіме Зянона Пазьняка ў Іўі кандыдатам мае быць былы палітвязень Іван Крук з АГП.

Фронтаўцы выдавец «Нашага слова» Станіслаў Суднік будзе балятавацца ў Лідзе, а доктар Іван Шэга — у Слоніме.

Ці ня самае моцнае прадстаўніцтва ПКБ на Гомельшчыне. Ажно сем чалавек — Віктар Хоміч (Гомельская Юбілейная), Уладзімер Сякерка (Гомельская Сяльмашаўская), Сяргей Сяргеенка (Гомельская Прамысловая), Міхаіл Сілівонец (Жыткавічы), Валер Рыбчанка (Жлобін), Віктар Назаранка (Калінкавічы), Сяргей Дайнэка (Сьветлагорск).

Толькі на аднаго штыха менш за камуністаў на Гомельшчыне мае АГП. Кандыдат на старшыню партыі Мікалай Гаўрыленка зойме Палескую акругу, Віктар Палякоў — Гомельскую Савецкую, Адам Варанец — Гомельскую вясковую, Леанід Судаленка — Хойніцкую, Леанід Арлоў — Мазырскую.

Валеры Пуціцкі з БНФ будзе балятавацца ў Рэчыцы, а Кастусь Жукоўскі з БХД — у Буда-Кашалёве.

Галоўны рэдактар «Товарища» Сяргей Вазьняк ідзе на выбары на Талачыншчыне, Віталь Броўка (БНФ) — на Пастаўшчыне, Алег Тычына (АГП) — на Лепельшчыне, Яраслаў Берніковіч (БНФ) — на Глыбоччыне.

Як бачым, апазыцыя вызначыла сваіх кандыдатаў ва ўсіх акругах. Застаецца немагчымае — хоць дзесьці арганізаваць паралельны падлік галасоў.

**Зьміцер Панкавец**

### Хто ў лесе, хто ў стрэсе

«Эўрапейская Беларусь» абяцае выставіць 60 кандыдатаў, хоць палова яе заснавальнікаў выбары байкатуюць.

Старшыня аргкамітэту Народнай грамады Мікола Статкевіч абяцае, што на восеньскіх парлямэнцкіх выбарах ягоная «Эўрапейская кааліцыя» выставіць каля 60 кандыдатаў. І гэта нягледзячы на тое, што «Хартыя-97» і «Малады фронт», іншыя элемэнты кааліцыі, выказаліся за байкот. Чаму сябры партыяў Статкевіча і Навасяда не ідуць па агульным сьпісе кандыдатаў АДС?

«Пачынаючы зь мінулага лета, мы неадназова зьвярталіся да кіраўніцтва АДС з прапановай выпрацаваць агульную выбарчую плятформу, якая б грунтавалася на ідэі эўраінтэграцыі. Аднак намаганьнямі прарасейскіх сілаў унутры апазыцыйнай кааліцыі нашы прапановы былі адрынутыя», — кажа М.Статкевіч.

«Усё, што расколвае АДС, — дэструктыўная пазыцыя», — адказвае Статкевічу намесьнік старшыні ПКБ Валеры Ўхналёў.

«Наш удзел у выбарах — гэта спроба змаганьня з апатыяй і расчараваньнем, — парыруе М.Статкевіч. — Асабіста я хачу пайсьці на выбары ў Менску па акрузе, дзе безь мяне не было дастатковай агітацыі за далучэньне Беларусі да ЭС», — падсумоўвае палітык.

# Галоўнае ня ўдзел

Байкот застаецца больш складанай для ажыцьцяўленьня тактыкай, чым удзел. Піша **Віталь Тарас**.

Беларусь апошнім часам нярэдка параўноўваюць з Зымбабвэ. Не ў парадку іроніі, а проста таму, што паводле індэксаў, якія складаюць міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, абедзьве краіны стаяць, як правіла, побач. Можна па-рознаму ставіцца да тых індэксаў, але факт палягае на тым, што вось ужо больш за дваццаць гадоў зымбабвійская апазыцыя ня можа перамагчы на выбарах прэзыдэнта Робэрта Мугабэ і ягоную партыю.

Між іншага, Зымбабвэ — прэзыдэнцкая рэспубліка з дзьвюхпалатным парлямэнтам. І вось мэханізм аўтарытарнай улады ўпершыню даў збой: на выбарах у ніжнюю палату выбарчыя камісіі зь нейкіх прычынаў не змаглі, як звычайна, сфальшаваць вынікі галасаваньня. Апазыцыя заваявала большасьць месцаў у парлямэнце, а яе лідэр Морган Цвангіраі на прэзыдэнцкіх выбарах апярэдзіў Робэрта Мугабэ. Гэта яшчэ ня значыць, што ў другім туры, прызначаным на канец чэрвеня, апазыцыйны кандыдат атрымае перамогу. 84-гадовы прэзыдэнт, поўны сіл і энэргіі, клянецца сарваць «злачынную змову прадажнай апазыцыі і брытанскіх імпэрыялістаў». Рэпрэсіі супраць апазыцыі набіраюць моц. Цвангіраі баіцца вяртацца ў краіну з паездкі ў Лёндан праз рэальную пагрозу фізычнай расправы над ім. Але галоўнае палягае на тым, што тамтэйшая апазыцыя прычакала свайго шанцу і змагаецца да канца — замест таго, каб байкатаваць выбары.

### Другая ліга

Дарэчы, варта адкінуць старыя стэрэатыпы, у тым ліку, што да «чорнай Афрыкі». У апошнім рэйтынгу свабоды прэсы Беларусь заняла 144-е месца ў сьвеце. А, напрыклад, экватарыяльная краіна Бэнін — 26-е, адразу ўсьлед за Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Яны апярэдзілі такія эўрапейскія дэмакратыі, як Італія, Гішпанія, Польшча…

ПАР, як вядома, выпаў гонар правесьці футбольны чэмпіянат сьвету 2010 году.

У нейкай меры сытуацыю ў палітыцы можна параўнаць з сытуацыяй у футболе.

Яшчэ нядаўна гульня зборнай Нігерыі на чэмпіянаце сьвету выклікала сэнсацыю. Потым захапленьне заўзятараў выклікалі футбалісты Камэруну. А цяпер ня тое што Сэнэгал з Кот-д'Івуарам, амаль усе афрыканскія краіны ўспрымаюцца спаборнікамі ўсур'ёз у сусьветным футболе. (Праўда, у гэтым працэсе ёсьць і адваротны бок. Нядаўна блогі абышоў фатаздымак.

**Працяг на старонцы 4.**

# АДС мяняе пасланьне




Кааліцыя апазыцыйных партый хоча ўдзельнічаць у выбарах і робіць стаўку на тэму кантролю за ўладай.

Лідэры апазыцыі ў панядзелак на адмысловай прэс-канфэрэнцыі выклалі сваю пазыцыю адносна ўдзелу ў сёлетніх парлямэнцкіх выбарах, а таксама прэзэнтавалі пасланьне Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС) да беларускага народу. На невялікім аркушы паперы фарматам А4 плянава-аналітычная група АДС выклала галоўныя палажэньні і мэты ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах.

Галоўны мэсыдж, які апазыцыйныя кандыдаты павінны данесьці да выбарцаў сёлета, зводзіцца да наступнай фразы: «Кантроль народу над уладай дасьць людзям новыя магчымасьці жыць лепей».

Каардынатар аналітычна-плянавай групы Вацлаў Арэшка кажа, што падчас працы над дакумэнтам былі ўзважаныя меркаваньні абсалютна ўсіх суб'ектаў АДС, працавалі ў агульнай групе і прадстаўнікі «Руху «За Свабоду». «Раней нашы пасланьні да людзей зыходзілі з таго, што мы абяцалі прыйсьці да ўлады, а ўжо пасьля зьмяніць сытуацыю ў краіне. Невыкананьне абяцанага ўспрымалася як параза. Мы абяцалі пяць крокаў да лепшага жыцьця, але выконваў іх ужо Лукашэнка. Сёньня мы можам даваць толькі рэальныя абяцаньні, якія ў стане выканаць, нават калі нас не абяруць дэпутатамі. Мы прапануем грамадзкі кантроль над дзеяньнямі ўлады. Незадаволенасьць людзей дзеяньнямі ўлады ўвесь час узрастае. Успомніце толькі ўвядзеньне кантрактнай сыстэмы і адмену льгот. Цяпер рыхтуецца школьная рэформа, якая таксама можа выклікаць незадаволенасьць. Людзі не бяруць у прыняцьці гэтых указаў ніякага ўдзелу, ня могуць неяк паўплываць на сытуацыю. Тэму кантролю над уладай апазыцыйныя сілы будуць агітаваць цягам найбліжэйшых году — двух, магчыма, да прэзыдэнцкіх выбараў», — кажа В.Арэшка.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька называе канкрэтныя рэчы, якіх апазыцыя можа дамагчыся ў выпадку ўсталяваньня кантролю над уладай. «Па-першае, гэта адсутнасьць ценявога бюджэту і зьмяншэньне карупцыі ў краіне. Па-другое, правядзеньне судовай рэформы. Па-трэцяе, гэта дасьць грамадзтву выбар, то бок, дэпутатаў будуць абіраць, а не прызначаць. Па-чацьвертае, пературэньне СМІ ў рэальную чацьвертую ўладу. Усё залежыць ад таго, ці зможам мы данесьці наш мэсыдж да выбарцаў».

«Нават калі некалькі кандыдатаў пройдзе ў палату прадстаўнікоў, то гэта ўсё адно ня зьменіць рэальнай раскладкі сілаў у рэспубліцы, бо Лукашэнка дамінуе над усімі галінамі ўлады. Наша сёньняшняе пасланьне носіць пазытыўны характар, бо мае ў сабе альтэрнатыву. Мы ня хочам народу для ўлады, мы хочам ўладу для народу», — падкрэсьліў старшыня Партыі камуністаў Сяргей Калякін.

Старшыня аргкамітэту Партыі працы Аляксандар Бухвостаў лічыць, што дадзенае пасланьне выражае галоўную мэту, што трэба рабіць, каб зьмяніць уладу.

Намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка кажа, што бескантрольная ўлада паціху здасьць незалежнасьць.

«Улада часта спэкулюе, што яна народная. Але, прабачце, яна трымае людзей за быдла, якое знаходзіцца на пэрыфэрыі прыняцьця найважнейшых рашэньняў. Нам важна, каб людзі ўсьвядомілі, што неабходны кантроль над уладаю. Тады на Кастрычніцкую плошчу пачнуць выходзіць дзясяткі тысяч чалавек», — кажа Анатоль Лябедзька.

Дык ці будзе толк ад некалькіх дэпутатаў ад апазыцыі, якіх Лукашэнка можа дапусьціць у палату прадстаўнікоў? «Зьяўленьне дэмакратаў у парлямэнце дасьць новы імпульс у нашай барацьбе. Вельмі цяжка разбураць сыстэму, не знаходзячыся ў ёй», — мяркуе А.Бухвостаў.

«Я перакананы, што ніхто ня пусьціць апазыцыю ў палату. Але трэба рабіць усё магчымае, каб гэтую блякаду прабіць. Мы будзем ігнараваць усе абмежаваньні, што робіць улада, не баючыся зьняцьця з выбараў. Аднак ісьці на байкот мы ня маем права», — кажа В.Вячорка.

Паводле словаў Вацлава Арэшкі, гэтае пасланьне апазыцыі будзе распаўсюджвацца праз перадвыбарчыя матэрыялы будучых кандыдатаў у дэпутаты.

**Зьміцер Панкавец**

# Галоўнае ня ўдзел

**Працяг са старонкі 3.**

На адным — зборная Францыі 1958 году, дзе ўсе гульцы белыя. І зборная нашых дзён — ніводнага белага ў камандзе. Але гэта крыху іншая тэма.)

Зразумела, паміж футболам і дэмакратыяй — дыстанцыя гіганцкага памеру. Але ж Беларусь, на жаль, і ў пляне дэмакратыі, і ў пляне футболу застаецца ў другой, а то і трэцяй лізе. (У Зымбабвэ і ў некаторых іншых краінах выкарыстоўваюцца празрыстыя скрыні для галасаваньня, а назіральнікі ад апазыцыі маюць права назіраць працэс падліку галасоў ад пачатку да канца. Адна такая інавацыя каштавала б, дальбог, усіх дэмакратычных зьменаў, прапанаваных для ўдасканаленьня выбарчага заканадаўства РБ.)

Папулярны некалі лёзунг «галоўнае не перамога, а ўдзел» у палітыцы ня дзейнічае. Ён нават і ў спорце лічыцца сьмешным. Бо існуе такая рэч, як матывацыя. Калі ставіць перад сабой задачу ўдзельнічаць у выбарах выключна з мэтай «інфармаваць насельніцтва», дык вынік будзе такі, які мы бачылі на апошніх выбарах у мясцовыя саветы Беларусі. І наадварот, калі ставіцца мэта перамагчы (хай нават на ўзроўні лёзунгу), як гэта было на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах, улада пачынае нэрвавацца, тушавацца і рабіць памылкі.

Што ж тычыцца ідэі байкоту, якая вылучаецца кожнага разу перад чарговымі выбарамі, яе ініцыятараў эмацыйна зразумець можна. Калі выбары несвабодныя, несправядлівыя і непразрыстыя — значыць, далоў такія выбары! Але ж палітычныя партыі, калі яны прэтэндуюць на тое, каб звацца партыямі, ня могуць ня ўдзельнічаць у барацьбе за галасы выбарцаў. Хоць і не павінны толькі гэтым абмяжоўвацца.

### Работа над памылкамі

З другога боку, ініцыятары байкоту павінны разумець, як мінімум, адну рэч. Байкот — гэта тая самая выбарчая кампанія, толькі зь іншым знакам. Тут таксама патрэбная барацьба за выбарцаў. Ці гатовыя аўтары ідэі байкоту правесьці сапраўдную масавую кампанію — ня меней, а можа быць, і болей складаную, чым выбарчая? Кампанію, якая патрабуе дадатковых арганізацыйных і псыхалягічных высілкаў, паколькі спробы байкоту, натуральна, будуць выклікаць рэпрэсіі з боку ўладаў. Магчыма, прыхільнікі ідэі байкоту і гатовыя пайсьці, што называецца, ад дзьвярэй да дзьвярэй, каб тлумачыць выбарцам, чаму ім ня трэба галасаваць. Некаторыя актывісты, напэўна, гатовыя да затрыманьняў, штрафаў, звальненьняў. Самаахвярнасьць — вялікая сіла ў палітыцы. Але яна, на жаль, не перадаецца з рук у рукі, падобна ўлёткам. Пераканаць жа большасьць насельніцтва ў тым, што трэба падтрымаць байкот толькі таму, што яго прыхільнікаў караюць — задача даволі дзіўная.

Існуюць, вядома, розныя формы байкатаваньня. У тым ліку і пасіўныя. Можна не ісьці на выбары, можна прагаласаваць супраць усіх, можна сапсаваць выбарчы бюлетэнь, можна забраць яго з сабой. Гэта пералік некаторых пратэстных мэтадаў, прыдуманых за апошні час. Які палітычны вынік яны даюць — можна меркаваць хоць бы на прыкладзе апошніх выбараў у расейскую Думу.

Справа ў тым, што любая форма галасаваньня альбо няўдзелу ў ім ня можа паўплываць на ягоныя вынікі ва ўмовах, калі падлік галасоў ад простых выбарцаў не залежыць і зусім не цікавіць начальства. (Нездарма ў Беларусі выбарчыя бюлетэні пасьля выбараў зьнішчаюць.) І таму выбар ператвараецца ў індывідуальную справу выбарца. Якога, дзякаваць Богу, пакуль яшчэ не пазбавілі падмурковага права на тайну галасаваньня. А для таго, каб падштурхнуць кожнага зрабіць выбар, патрэбная доўгая і сумная праца. Патрэбныя ня тысячы, дзясяткі тысяч сустрэчаў з выбарцамі штодня. Трэба ўпарта і дасьціпна тлумачыць (у тым ліку і самім сабе) за што і чаму трэба галасаваць альбо не галасаваць. І пад якімі лёзунгамі апазыцыя ідзе (ці не ідзе) у палату прадстаўнікоў. А для пачатку трэба, прынамсі, гэтыя лёзунгі мець.

І тады я, як шараговы абываталь, змагу зрабіць свой усьвядомлены выбар.

Калі, зразумела, некага цікавіць мой голас.

# Рыхтуецца прыватызацыя «Нафтану» і «Паліміру»

У Беларусі актывізаваліся прыватызацыйныя працэсы.

У панядзелак А.Лукашэнка вёў асабістыя перамовы з кіраўніком кампаніі «Базэл» аб продажы МАЗу. У аўторак намесьнік старшыні канцэрну «Белнафтахім» паведаміў аб разглядзе магчымасьці продажу «Нафтану» і «Паліміру». На чарзе стаяць таксама банкі і мабільны апэратар «БеСТ». Сярод пакупнікоў — турэцкія, нямецкія і грузінскія, але больш за ўсё — расейскія інвэстары.

### «Палімір» і «Нафтан» аб'ядназоць і прададуць

Разглядаецца варыянт продажу акцыяў «Паліміру» і «Нафтану» адзіным гаспадарчым комплексам, паведаміў намесьнік старшыні канцэрну «Белнафтахім» Міхаіл Асіпенка ў аўторак. Прапановы па прыватызацыі прадпрыемстваў канцэрн плянуе прапанаваць ураду да канца году.

На сёньня вядуцца перамовы з двума патэнцыйнымі інвэстарамі. «Хутчэй за ўсё доля інвэстара будзе роўнай зь дзяржаўнай доляй, мы плянуем 50 на 50, разуменьне патэнцыйных пакупнікоў у гэтым ёсьць», — заявіў М.Асіпенка. Паводле яго, ацэнку прадпрыемстваў правядуць міжнародныя экспэрты. Згодна з праграмамі разьвіцьця ў «Палімір» неабходна інвэставаць $1,8 млрд, а ў «Нафтан» — звыш $600 млн.

Аглядальніца газэты «Белорусы и рынок» Тацяна Манёнак называе продаж прадпрыемстваў абсалютна нармальным працэсам. Зь яе словаў, чатыры гады таму такі варыянт разглядаўся, але пакупнікоў напалохалі прапанаваныя ўмовы ўгоды. У 2006 годзе таксама меркавалі аб'яднаць «Палімір» і «Нафтан» у адно прадпрыемства. Тады той вераемны комплекс расейскія «Слаўнафта» і «Лукойл» дамовіліся набыць пароўну. Цяпер, зважаючы на лёс уласьніка «Слаўнафты» Міхаіла Гуцарыева, застаўся «Лукойл», які і будзе, на думку экспэрта, тым самым стратэгічным інвэстарам. Інакш, калі сюды прыйдзе заходні інвэстар, на заўтра ж нам адключаць пастаўкі нафты. Наша нафтаперапрацоўка моцна залежыць ад сыравіны. У выпадку продажу прадпрыемстваў расейцам, можна будзе разьлічваць на лепшыя ўмовы з пастаўкай сыравіны. «Нафтан» і «Палімір» уклалі велізарныя сродкі ў праграмы разьвіцьця, таму маюць вострую патрэбу ў стратэгічным інвэстары. Звышпрыбыткі ад перапрацоўкі нафты забірае дзяржава. Працэс акцыянаваньня прадпрыемстваў «Белнафтахіму» ня будзе хуткім: бакі будуць гандлявацца, а беларусам трэба вырашыць пытаньне сацыяльнай інфраструктуры, кажа Т.Манёнак.

На сёньня, пры шалёных цэнах на нафту ў сьвеце, нафтаперапрацоўчыя заводы ператварыліся ў «залатыя» прадпрыемствы. Цана і значэньне «Нафтану» параўнальныя зь «Белтрансгазам».

### Дзерыпаска хоча МАЗ

На пачатку тыдня ў Менск завітаў кіраўнік холдынгу «Базавы элемэнт», кіраўнік ААТ «Расейскія машыны» Алег Дзерыпаска. Ён меў сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам, у часе якой вялося пра кааперацыю вытворчасьці. І хоць афіцыйна пра продаж МАЗу расейцам не паведамлялася, незалежныя СМІ пачалі настойліва агучваць магчымасьць такога разьвіцьця падзеяў.

Эканамічны экспэрт Аляксандар Алесін мяркуе, што такое больш чым магчыма. На яго думку, Дзерыпаску могуць аддаць 50% акцыяў МАЗу. Паводле экспэрта, Дзерыпаска спрабуе набыць Менскі аўтазавод ужо 10 год, аднак прапануе надта малую цану. Папярэднія сустрэчы не анансаваліся афіцыйна, і тое, што цяпер пра візыт расейскага алігарха паведамляе БЕЛТА, кажа сп.Алесін, сьведчыць пра сур'ёзнасьць намераў. Справа ў тым, што Алегу Дзерыпаску МАЗ насамрэч вельмі неабходны. Ён набыў Яраслаўскі аўтазавод і для поўнага камплекту не хапае Менскага аўтазаводу. Пытаньне толькі ў тым, наколькі ён здолее зацікавіць беларускі бок. Сапраўдная цана МАЗу — не адзін мільярд даляраў. Зважаючы на вялікі інтарэс з боку расейцаў, атрымаць яны могуць ад 25 да 50% акцыяў.

Працэдура продажу можа расьцягнуцца не менш, як на год, бо прадпрыемства спачатку трэба акцыянаваць. Да таго ж, беларускі ўрад мяркуе, што з часам цана МАЗу будзе толькі расьці па меры росту расейскага рынку.

### Туркі набылі БеСТ?

Напрыканцы красавіка расейскія СМІ паведамі пра продаж 80% акцыяў дзяржаўнага сотавага апэратара БеСТ турэцкай кампаніі Turkcell. Ні турэцкі, ні беларускі бакі не камэнтавалі тую інфармацыю. Раней даходзілі супярэчлівыя весткі: міністар сувязі і інфарматызацыі Мікалай Панцялей запэўніў, што БеСТ ня мае патрэбы ў дапамозе замежных інвэстараў. Але 20 траўня беларускі міністар эканомікі Мікалай Зайчанка паведаміў, што Беларусь разьлічвае атрымаць ад продажу акцыяў дзяржаўнага сотавага апэратара ня менш за $500 млн.

Тым часам расейская кампанія АФК «Сыстема», якой належыць ААТ «МТС», вядзе перамовы пра набыцьцё мабільнага падразьдзяленьня Telekom Austria. Нагадаем, што Telekom Austria валодае 70% акцыяў беларускага сотавага апэратара Velcom. На гэты актыў прэтэндуюць, акрамя АФК «Сыстемы», Vodafone і Telefonica, аднак перавага нібыта аддаецца менавіта расейцам. Апошнія, у выпадку прыходу на беларускі рынак, разьлічваюць такім чынам пазьбегнуць цэнавых войнаў зь беларускай даччыной кампаніяй МТС.

### Прадаюцца банкі адны за адным

Паводле «Інтэрфаксу», кампанія ABH Holding Corp. да 1 ліпеня цалкам выкупіць акцыі беларускага «Міжгандальбанку», што належаць сярод іншых Нацыянальнаму банку і ў Беларускаму мэталюргічнаму заводу. Цана ўгоды — $32 млн.

Нямецкі Commerzbank набудзе «Белінвэстбанк», да канца году будзе прададзены таксама «Белпрамбудбанк», заявіў як пра вырашанае старшыня Нацбанку Пётра Пракаповіч.

Ня выключаны таксама продаж вялікіх пакетаў акцыяў «Беларусбанку» і «Белаграпрамбанку».

Тым часам «Банк Грузіі» набыў 70% акцыяў дробнага «Беларускага народнага банку». Рэшту пакету па дамоўленасьці зь беларускім бокам «БГ» зможа набыць цягам наступных трох гадоў. Кошт акцыяў склаў $34,2 млн.

Паказальна, што ніводнае буйное прадпрыемства не трапляе ў рукі беларускага ўласьніка — такіх навідавоку няма.

**Сямён Печанко**

# Першы крок Пуціна-прэм'ера

Уладзімір Пуцін надаў магутны імпульс стварэньню нафтаправоду БТС-2, што мае пралегчы ў абыход Беларусі. 14 траўня, праз некалькі дзён пасьля прызначэньня, новы прэм'ер Расеі паведаміў, што нафтаправод будзе збудаваны, а ягонае адгалінаваньне працягнецца да Кірышынскага НПЗ кампаніі «Сургутнафтагаз».

Кажучы пра запампоўку нафты ў БТС-2, Пуцін сказаў: «Зыходзім з таго, што ў прадстаўленым нашымі нафтавымі кампаніямі ў «Транснафту» графіку павелічэньня здабычы мы бачым лічбу — 67 з гакам мільёнаў тон дадатковай здабычы да 2015 году». Усяго для загрузкі БТС-2 «спатрэбіцца 30 млн т сырой нафты й 18—20 млн т нафтапрадуктаў».

«Мы плянуем, што тут, у Вусьць-Лузе, увесь аб'ём перавалкі [нафтапрадуктаў] складзе недзе 130—131 млн т, у Прыморску — 120 млн т. Плянуем выйсьці на гэта за пару гадоў», — сказаў Пуцін.

Варта адзначыць, што праз Беларусь ідзе 90 млн т расейскай нафты. Сукупная магутнасьць беларускіх НПЗ складае каля 22 млн т. На падставе лічбаў, агучаных прэм'ерам Расеі, можна прадказаць магчымасьць скарачэньня транзыту нафты праз Беларусь да 28 млн т у выпадку стварэньня БТС-2.

Тым ня менш, нават калі БТС-2 будзе створаная, Расея наўрад ці цалкам згорне транзыт нафты праз тэрыторыю Беларусі.

**АТ**

## СЬЦІСЛА

### З пачатку году ў Беларусь прыйшло $2,1 млрд

За першы квартал 2008 году ў рэальны сэктар эканомікі (акрамя банкаў) замежныя інвэстары ўклалі $2,1 млрд, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу. Гэта ў 1,7 разы больш, чым за першы квартал 2007 году. Найбольш актыўна замежнікі інвэставалі ў агульную камэрцыйную дзейнасьць па забесьпячэньні функцыянаваньня рынку (45,5% усіх інвэстыцый), прамысловасьць (36,3%), гандаль і грамадзкае харчаваньне (5,5%). Асноўнымі інвэстарамі былі суб'екты гаспадараньня Брытаніі (33,4%), Расеі (25%), Швайцарыі (13,2%), Аўстрыі (11,8%), Кіпру (5,3%). На долю наўпростых замежных інвэстыцый прыходзілася 29 % ад усіх атрыманых паступленьняў, што ў параўнаньні з першым кварталам мінулага году ў 2,4 разы больш.

### Сямашка ў Вене

Дэлегацыя Беларускай калійнай кампаніі ўзяла ўдзел у штогадовай канфэрэнцыі Міжнароднай асацыяцыі вытворцаў угнаеньняў (IFA — International Fertilizer Association) 19—21 траўня ў Вене. На прэзэнтацыі БКК прысутнічаў таксама першы намесьнік прэм'ер-міністра Беларусі Ўладзімер Сямашка. У мінулым годзе экспартная выручка ад рэалізацыі прадукцыі ВА «Беларуськалій» павялічылася ў параўнаньні з 2006 годам на $325 млн і склала $1,325 млрд Сёлета «Беларуськалій» чакае прыбытак ад экспарту ў аб'ёме $2,8—3 млрд. Ён вядзе будаўніцтва новых руднікоў — Чырвонаслабодзкага і Бярозаўскага, якое плянуецца завяршыць адпаведна ў 2009 і 2012 гадах.

### Адзін падатак для бедных і багатых

Адзіная стаўка падаходнага падатку на ўзроўні 12% можа быць усталяваная ў Беларусі. У Мінфіне ўжо ёсьць падрыхтаваны праект, але канчатковае рашэньне ў гэтым пытаньні яшчэ не прынятае. Цяпер беларусы адлічаюць падаткі ў дзяржаўны скарб па прагрэсіўнай сыстэме. Для фізычных асоб дзейнічае пяць ставак — 9%, 15%, 20%, 25% і 30% ад даходу. Пераход да адзінай для ўсіх 12-адсоткавай шкалы значна спрасьціў бы парадак спагнаньня асноўнага падатку.

### Рост бясьпекі аўто

Эўракамісія мае абавязаць вытворцаў аўто забясьпечваць усе легкавікі электроннай сыстэмай стабілізацыі руху. Прыстасаваньне павышае сабекошт машыны прыкладна на 950 даляраў, але будзе гарантаваць, напрыклад, што аўтамабіль не перавернецца на сьлізкай дарозе пры павароце. Паводле ацэнак, яго масавы ўжытак зьнізіць колькасьць сьмерцяў на дарогах. Абавязковай стане таксама сыгналізацыя незашпіленых рамянёў. На думку спэцыялістаў, продажная цана ня вырасьце ад таго значна, з прычыны вялікай канкурэнцыі на рынку.

**СП**

# Улада «рыхтуецца да найгоршага»

Са сьвістам разыходзяцца направа і налева акцыі банкаў. Назаўтра пасьля візыту Дзерыпаскі стала вядома, што рыхтуюцца да прыватызацыі яшчэ дзьве знакавыя адзінкі «фамільнага срэбра» — «Нафтан» ды «Палімір». Піша Аляксандар Класкоўскі.

У панядзелак расейскі алігарх №1 Дзерыпаска таргаваўся ў Менску наконт МАЗу. Не асобнай машыны, як вы разумееце, а ўсяго гіганта беларускай індустрыі. Аднаго з тых, пра якія да пары да часу патэтычна гаварылася пад лёзунгам «Не дамо распрадаць Радзіму!».

Сёньня працэс распродажу пакаціўся як сьнежны камяк з гары. Са сьвістам разыходзяцца направа і налева акцыі банкаў. Назаўтра пасьля візыту Дзерыпаскі стала вядома, што рыхтуюцца да прыватызацыі яшчэ дзьве знакавыя адзінкі «фамільнага срэбра» — «Нафтан» ды «Палімір».

Канечне, таму ж Дзерыпаску рана паціраць рукі, бо нашыя начальнікі, як вядома, гаспадары свайго слова: хочуць — даюць, хочуць — бяруць назад. Але ўвогуле трэнд відавочны. Мадэль дзяржаўнага сацыялізму канае. «Блакітныя фішкі» ідуць з малатка.

І вось што цікава. Незалежныя эканамісты падкрэсьліваюць: калі летась (возьмем сюжэт з «Вэлкамам») катастрафічна неставала валюты, каб разьлічыцца за газ і г.д., то зараз сытуацыя іншая. Зноў акрыяў гандаль нафтапрадуктамі, імкліва даражэе калій — так што замежныя грошыкі ў казну плывуць спраўна.

Напрошваецца выснова: наверсе ўвайшлі ў смак. Псыхалягічны бар'ер пераадолены. Непразрысты «распродаж Радзімы» пакідае электарат індыфэрэнтным. Людзі не пачуваюцца гаспадарамі ўласнасьці, якую прапаганда шмат гадоў патэтычна называла народнай. І намэнклятура сьпяшаецца канвэртаваць уладу ва ўласнасьць, неўпрыкмет зьмяніць мадэль — і пры гэтым, як і раней, здымаць вяршкі.

Каб прыватызаваць монстраў саціндустрыі, патрэбен час. Грошыкі ад гэтых угодаў рэальна прыйдуць недзе пад наступныя прэзыдэнцкія выбары (тыя, наконт якіх ужо сказана: «Рыхтуйцеся да найгоршага»). Коштам продажу самага паплатнага ўлады спадзяюцца ўзьняць заробкі да 700 даляраў, каб утрымацца ў 2010-м.



**«Слаўнафта», «Белтрансгаз», «Нафтан», МАЗ — прадпрыемства за прадпрыемствам пераходзіць пад наўпросты ці ўскосны кантроль расейцаў. На фота: патэнцыйны пакупнік МАЗу, алігарх Алег Дзерыпаска. Яму, як Лукашэнку, забаронены ўезд у ЗША.**

# Абое рабое

Канфрантацыйная замежная палітыка Крамлю вынікае з аднадушнай волі як расейскай эліты, так і шырокіх пластоў насельніцтва, і няма падставаў спадзявацца на яе перамену пасьля прыходу Мядзьведзева. Піша Іван Красьцеў.



WALL STREET JOURNAL

Нікаля Сарказі і Карла Бруні адпачываюць. Яны больш не прэзыдэнцкая парачка нумар адзін у сьвеце. Цяпер гэта Ўладзімір Пуцін і Дзьмітры Мядзьведзеў. Стасункі паміж імі відавочна блізкія, але настолькі ж замкнёныя, таямнічыя, што і выклікае супярэчлівыя інтэрпрэтацыі. Экспэртаў і простых расейцаў цяпер трывожыць толькі адно: ці змогуць ужыцца былы і цяперашні прэзыдэнт краіны? І чаго чакаць ад такога сужыцьця, дабра ці ліха?

Аптымісты спадзяюцца, што інаўгурацыя Дз.Мядзьведзева і пераход ягонага старэйшага і вышэйшага настаўніка на пасаду прэм'ер-міністра ў маскоўскім Белым Доме прывядзе да ўтварэньня сыстэмы стрымак і процівагі і пашырэньня плюралізму ў расейскай палітыцы. Пэсымісты ж пабойваюцца зацятых канфліктаў у шэрагах кіраўнічай клясы, якія, крый Божа, скончацца міжусобіцамі. Кажучы словамі Пуціна, «цэнтралізаваная ўлада закладзеная ў ДНК Расеі».

Хоць на расейскім гербе выява дзьвюхгаловага арла, гісторыя навучыла расейцаў разглядаць дзьвюхгаловую ўладу як пачвару. Апошняе процістаяньне адбылося на пачатку 1990-х паміж Барысам Ельцыным і парлямэнтам і скончылася яно капітуляцыяй парлямэнту. Сёньня ж падобная небясьпека, нягледзячы на заявы спадарства з Санкт-Пецярбургу, зь цягам часу абавязкова будзе нарастаць.

За часамі Пуціна кіраўнічая эліта навучылася лёгка пазбаўляцца канкурэнцыі звонку. Але нашмат цяжэй трымаць саму эліту пад кантролем. Выбары ладзяцца раз на чатыры гады, а сацыялягічныя дасьледаваньні — пастаянна. Бойка за грамадзкую думку будзе нашмат цяжэйшай за бойку за галасы: што здарыцца, калі рэйтынг Мядзьведзева перасягне рэйтынг прэм'ер-міністра Пуціна?

Складанейшым будзе кантроль і за СМІ, якіх можна вельмі лёгка прымусіць быць ляяльнымі да аднаго цара, а не да двух. Падобным чынам крамлёўскія алігархі — у Расеі так сталася, што людзі, якія валодаюць краінай, ёю ж і кіруюць, — будуць мець больш як аднаго судзьдзю для вырашэньня сваіх спрэчак. А што калі Мядзьведзеў захоча калі-небудзь ужыць свае прэзыдэнцкія паўнамоцтвы, хоць яны і былі падараваныя яму з ласкі Пуціна? Калі ён міні-я прэм'ер-міністра, то зрабіць гэтага яму не наканавана.

Адным словам, узаемныя падазрэньні і інтрыгі паміж Крамлём Мядзьведзева і Белым Домам Пуціна непазьбежныя — і могуць быць нават горшымі, чым паміж Крамлём і Белым Домам у Вашынгтоне. Спадарства Пуцін і Мядзьведзеў сёньня шчыра сьцьвярджаюць, што палітычнай вайны можна ўнікнуць. Але насампраўдзе вайна паміж іхнімі акружэньнямі ўжо пачалася.

* * *

Плянуючы перадачу ўлады, новы прэм'ер-міністар — і дагэтуль найгалоўнейшы з усіх лідэраў краіны — патрапіў захаваць палітычную пераемнасьць у кароткатэрміновай пэрспэктыве. Але відавочна ён не патрапіў стварыць стабільнай палітычнай сыстэмы. За два пуцінскія тэрміны расейская дзяржава стала багацейшай (дзякуючы высокім цэнам на нафту), больш рэпрэсіўнай і больш цэнтралізаванай; але вось ня стала кіраванай больш эфэктыўна. Адно даваць рады нязгодным ці ладзіць вайсковыя парады, а іншая справа — эфэктыўна кіраваць гэтай агромністай краінай.

Пуцінская сыстэма — гэта клясычны прыклад «імпатэнцыі ўсясільнага». На сёньня Расея — гэта сусьветная дзяржава, якая набірае моцы, але ў той самы час гэта слабая дзяржава з карумпаванымі і неэфэктыўнымі інстытуцыямі. Яе войска і сыстэма адукацыі засталіся на ўзроўні мінулага стагодзьдзя; замежная і сацыяльная палітыкі — на ўзроўні XIX ст. Эканамічны рост Расеі ўражвае, але ён няўстойлівы. І гэтаму палітычнаму рэжыму, абцяжаранаму неэфэктыўнай уладай, сканцэнтраванай у Крамлі, нестае дынамізму, каб даць штуршок трансфармацыі Расеі. Усякі зрух ва ўладных колах пераўтвараецца ў крызіс. Усякая зьмена ўлады прыводзіць да брутальнага пераразьмеркаваньня ўласнасьці.

Унутрана закладзеная ў пуцінізм нестабільнасьць — вось тлумачэньне нядаўніх віражоў у замежнай палітыцы. Агрэсіўнае стаўленьне Масквы да іншых краінаў, асабліва да Захаду, патрэбнае для таго, каб захаваць легітымнасьць постпуцінскага рэжыму. Але гэта прыводзіць да парадоксу: Захад патрэбны Крамлю як партнэр для разьвіцьця Расеі, але яшчэ больш Захад патрэбны Крамлю ў якасьці ворага, каб не выпускаць уладу з сваіх рук.

У сваіх поглядах на Расею Захад прытрымліваўся дзьвюх небясьпечных ілюзіяў: маўляў, уладная эліта дзеліцца на дзьве выразна акрэсьленыя групоўкі: першая — лібэральная, празаходняя, аматары Deep Purple, як, напрыклад, Мядзьведзеў; другая — антызаходняя і аўтарытарная, КГБісты (ці «сілавікі»), атачэньне Ўладзімера Пуціна. І таму перамога «лібэралаў» над аўтарытарнай групоўкай, як лічыць Захад, — гэта неабходная рэч, каб гарантаваць дэмакратыю ў Расеі. Мы таксама трымаліся гэтага памылковага меркаваньня ў 1990-х.

Але супярэчлівы характар расейскага рэжыму ня ёсьць вынікам няскончанай вайны паміж «лібэраламі» і «сілавікамі». Гэта вынік дваістага характару мадэрнізацыі Расеі. За апошні дзясятак гадоў Расея стала больш празаходняй, але ў той самы час больш антызаходняй. Яна стала больш адкрытай, але ў той самы час больш нацыяналістычнай. Новая канфрантацыйная замежная палітыка Крамлю не магла паводле свайго характару стаць вынікам абставінаў, і асабістым выбарам У.Пуціна таксама лічыцца ня можа. Гэта вынік усеагульнае згоды наконт новай замежнай палітыкі як сярод расейскай эліты, так і сярод шырокіх пластоў насельніцтва.

Зьмена асобаў пры ўладзе наўрад ці паўплывае на гэтую згоду. Надзея на тое, што эканамічны рост, павелічэньне сярэдняй клясы і зьмена пакаленьняў можа зьмякчыць антызаходнія настроі ў Расеі, аблудная. Нягледзячы на тое, што расейцы карыстаюцца iPod-амі ці палюбілі капучына, іхныя палітычныя погляды ня сталі ані больш прадэмакратычнымі, ані антызаходнімі. Паводле зьвестак нядаўняй сацыялягічнай апытанкі, найбольш антыамэрыканскі сэгмэнт насельніцтва Расеі — гэта мужчыны, якія маюць адукацыю і жывуць у Маскве.

Пуцінска-мядзьведзеўскі рэжым перацякае ў да болю вядомую Расеі стадыю. За апошнія 150 гадоў Расея ня раз ажыцьцяўляла шэраг лібэральных рэформаў, якія забясьпечвалі на пэўны час істотны эканамічны рост, але ў выніку ўсяго гэтага распачыналіся войны паміж элітамі за пераразьмеркаваньне ўлады і багацьця, і прыходзіла спакуса выкарыстаць здабытыя эканамічныя выгоды на патураньне геапалітычным амбіцыям Расеі. Міжвольным вынікам рабілася ўзмацненьне сацыяльнай напружанасьці, згортваньне рэформаў і ў выніку сацыяльная і палітычная катастрофа. Зараз галоўная мэта палітыкі Захаду адносна новай уладнай парачкі ў Расеі павінна заключацца ў дапамозе Маскве пазьбегнуць паўтору такога сцэнару.

**Пераклаў РМ**
**паводле «Ўол-Стрыт Джорнал»**

**Іван Красьцеў**

**выдатны баўгарскі палітоляг, старшыня Цэнтру лібэральных стратэгіяў у Сафіі.**

# Тактыка кроплі

**Працяг са старонкі 1.**

Салігорск сёлета рыхтуецца да 50-годзьдзя гораду. Палова вуліц перарытая бульдозэрамі і экскаватарамі. Кладуць новую плітку, фарбуюць дамы. Са словаў мясцовага актывіста Паўла Батуева, горад перажывае цяпер сытыя часы. На калійным камбінаце істотна павысіліся заробкі, бо сусьветныя цэны на калійныя ўгнаеньні дасягнулі занябёсных узроўняў. Салігорск па праве лічыцца адным з найбагацейшых гарадоў краіны.

Першая сустрэча ў Салігорску была заплянаваная на рынку. Людзі адразу пачалі падыходзіць, вітацца зь Мілінкевічам. Расказваць пра свае праблемы. Нейкая жанчына ў сэрцах аж выгукнула: «А я думала, што пасьля выбараў Вы даўно за мяжу зьехалі».

Большасьць прадпрымальнікаў у размовах зь Мілінкевічам наракае, што працаваць ім у гэтай сфэры засталося зусім няшмат, ці не апошні год. Зьвяртае ўвагу, што ўжо цяпер на рынку не працуе каля 10% крамак. «І гэта ня толькі ў Салігорску, так па ўсёй краіне», — уздыхаюць гандляры. Некаторыя зь іх былі на вулічных пратэстах у Менску ў пачатку зімы.

Неяк пакрысе вакол Мілінкевіча сабраліся чалавек шэсьцьдзесят. Рэакцыя людзей абсалютна пазытыўная. Толькі адзін здаравенны дзяцюк, запытаўшыся, што тут адбываецца, сказаў: «І чым вам дапаможа той Мілінкевіч»?

Прадпрымальнікі наракаюць на адсутнасьць незалежнай прэсы ў горадзе. На тое, што далёка ня кожны пакуль можа карыстацца інтэрнэтам. «Аляксандар Уладзімеравіч, а ў нас увогуле пэрспэктыва ёсьць?» — пытаецца адна гандлярка. «Безумоўна», — кажа Мілінкевіч.

Бачачы, што натоўп вакол экскандыдата працягвае няспынна расьці, падышлі чатыры міліцыянты. Адзін зь іх, старшы лейтэнант (у той час калі маёр і падпалкоўнік ціхенька стаялі за ягонай сьпінай), просіць людзей разысьціся, бо акцыя не санкцыянаваная. Мілінкевіч спрабуе растлумачыць, што свабода сходаў запісаная ў Канстытуцыі.

Ці ня ў гэты самы момант Аляксей Кавалец хапае мяне за руку са словамі: «Пабеглі хутчэй, у машыне спрабуюць прабіць колы».

Сапраўды, як толькі кіроўца адышоў па каву, ля машыны зьявіліся два адкормленыя хлопцы ў чорных строях і з кароткімі фрызурамі. На шчасьце, Міша пасьпеў заўважыць, што адзін зь іх пачаў круціцца ля машыны. Дагнаў яго, нават злавіў, але хлопец працягваў вырывацца. «Ну ня буду ж я пачынаць біцца», — казаў Міша. Ніпэль у коле сапраўды быў скручаны. «Са Слонімам усё адно не параўнаць, калі нам у міліцэйскім дворыку прабілі тры колы», — кажа Мілінкевіч. Міліцыя абяцае разабрацца з гэтым.

Як толькі Мілінкевіч зьявіўся на праспэкце Юбілейным, у гэтым самым месцы ўзьніклі некалькі міліцэйскіх машын. У суправаджэньні міліцыянта палітык хадзіў нават у краму папіць соку. Усё старанна здымалася на відэакамэру.

Мілінкевіч яшчэ пасьпеў прайсьціся разам зь мясцовым актывам па гандлёвых радах, раздаўшы ўлёткі да Дня салідарнасьці. На гэтым візыт у горад гарнякоў лічыўся скончаным.

На самым выезьдзе з гораду машыну Мілінкевіча спыніла ДАІ. Сталі высьвятляць, ці не знаходзіцца гэты мікрааўтобус у вышуку. Была спроба зноў паспрабаваць дабрацца да Слуцку на папутках, але ўжо праз пару хвілін пад’ехалі міліцыянты на «Самандзе». Той самы старшы лейтэнант, які сачыў за Мілінкевічам падчас усёй паездкі, прапанаваў палітыку праехаць у пастарунак: «Усё ніяк мы з Вамі не разьвітаемся».

Міліцыянты казалі, маўляў, паступіла скарга ад людзей, што «ходит какой-то человек по рынку и за что-то агитирует». Міліцыянтаў бянтэжыла, пагражалі ўжыць фізычную сілу. Мілінкевіч стаяў на сваім: «Альбо прадстаўляйце афіцыйнае абвінавачваньне, або бярыце сілай».

Яшчэ праз пяць хвілін пад’ехаў асабіста начальнік салігорскай міліцыі Захарчук, які сказаў, што Мілінкевіч абвінавачваецца ў падрыхтоўцы масавай акцыі. Толькі пасьля гэтага лідэр «Руху «За Свабоду» сеў у міліцэйскую машыну.

Некалькі гадзін чаканьня ля пастарунку, на якім вісіць яшчэ савецкі герб, а ў дворыку стаіць бюст Фэлікса Дзяржынскага. Урэшце, а шостай вечара экс-кандыдата ў прэзыдэнты вязуць у суд. Мілінкевіч сам захацеў, каб яго судзілі ў гэты самы дзень. Убачыўшы, што працэс палітыка будзе весьці судзьдзя Бураўцоў, мясцовыя апазыцыянэры пачалі прагназаваць суткі. Мілінкевіч ня стаў аспрэчваць, што сапраўды распаўсюджваў улёткі да Дня салідарнасьці. Віны ён не прызнаў, спаслаўшыся на тое, што выконваў сваё канстытуцыйнае права.

Сьведкамі выступілі два гандляры з шапікаў, якіх проста змусілі сьведчыць супраць Мілінкевіча. Пасьля суду яны хавалі вочы. Пры канцы працэсу судзьдзя Бураўцоў папрасіў Мілінкевіча... крыху расказаць пра сябе. Нічога падобнага на судах прысутныя яшчэ ня бачылі. Судзьдзя, нават не выходзячы з залі, адразу вынес прысуд — 20 базавых велічынь (700 тысяч рублёў). Расхваляваная Людміла Гразнова пасьля суду ледзь змагла стрымаць сьлёзы.

Прыезд у Слуцак сарваўся. Шкада: там, паводле словаў арганізатара сустрэчы Віталя Амяльковіча, сабралася нямала людзей. Прыйшлі нават ідэалягічныя работнікі з гарвыканкаму.

На наступным тыдні Мілінкевіч зьбіраецца на Віцебшчыну.

**Зьміцер Панкавец**
**Салігорск — Менск**



АРЦЁМ ЛЯВА

**Чалавек зь відэакамэрай наўрад ці працуе на «Белсат», у лепшым выпадку — у міліцыі. Зьлева — начальнік Салігорскага РУУС Захарчук. Ён не прапануе Мілінкевічу грошай, каб той зьехаў з гораду. Проста вельмі нэрвуецца, і таму замест дакумэнта выпадкова дастаў купюру.**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 12 траўня

#### Менск

Намесьніца старшыні незарэгістраванага «Маладога фронту» **Наста Палажанка** атрымала адказ зь Міністэрства ўнутраных справаў на зварот з патрабаваньнем растлумачыць прычыны занясеньня яе ў «сьпіс нявыязных». Нагадаем, уначы 4 красавіка Насту высадзілі з цягніка, што накіроўваўся ў Варшаву, на падставе таго, што на яе нібыта заведзеная другая крымінальная справа. У лісьце з МУС гаворыцца, што пашпартныя дадзеныя Палажанкі трапілі ў сьпіс у выніку тэхнічнага збою. «МУС Беларусі прыносіць Вам свае прабачэньні», — гаворыцца ў адказе.

### 13 траўня

У пракуратуру Менску выклікалі на допыт у якасьці сьведкі каардынатара тэлеканалу «Белсат», сябру ўправы Беларускай асацыяцыі журналістаў **Эдуарда Мельнікава**. Допыт, які вёў сьледчы па асабліва важных справах **Віктар Шабан**, тычыўся «справы аб мультфільмах», на падставе якой 27 і 28 сакавіка ў кватэрах беларускіх журналістаў супрацоўнікі КДБ правяліператрусы. Мельнікава распытвалі і пра яго прыналежнасьць да «Белсату».

* * *

Напярэдадні Дня Волі мастака **Алеся Марачкіна** затрымалі ва ўласнай майстэрні і асудзілі на 5 сутак арышту нібыта за лаянку. У майстэрні правяліператрус, сканфіскавалі расьцяжкі і транспаранты, а таксама карціну «Лялькі». 13 траўня мастака выклікалі ў міліцыю Цэнтральнага раёну Менску. Міліцыянты цікавіліся, хто рабіў плякаты і куды яны былі прызначаныя, а таксама пыталіся пра іхны зьмест. Таксама міліцыянты задавалі пытаньні пра вядомую карціну «Лялькі». Паводле іхных словаў, будзе прызначаная экспэртыза малюнку.

#### Каменны Лог

Намесьніка старшыні незарэгістравага «Маладога фронту» **Артура Фінькевіча** затрымалі на беларуска-літоўскай мяжы, патлумачыўшы, што ён знаходзіцца ў сьпісе асобаў, якім часова забаронены выезд за мяжу. Палітыку ўсё ж паставілі пячатку ў пашпарце, паведаміўшы, што з 25 красавіка ён зьяўляецца часова невыязным.

### 14 траўня

#### Полацак

Пяць чалавек былі затрыманыя на цэнтральнай плошчы Полацку. Маладзёны выйшлі на плошчу з расьцяжкай «Свабоду палітвязьням». Акцыя была прымеркаваная да дня нараджэньня прадпрымальніка **Сяргея Парсюкевіча**, якому споўніўся 41 год. **Мікалая Дземідзенку**, **Сяргея Глінскага**, **Алеся Круткіна**, **Зьмітра Сакалова**, **Сяргея Каралёнка** адвезьлі ў Полацкі РУУС.

#### Магілёў, Горадня, Берасьце, Віцебск, Салігорск, Гомель, Жодзіна, Ліда...

Гадавіну рэфэрэндуму 1995 году, пасьля якога былі зьмененыя дзяржаўныя сымбалі Беларусі, незарэгістраваны «Малады фронт» адзначыў масавым вывешваньнем бел-чырвона-белых сьцягоў у Менску, у Магілёве, Горадні, Берасьці, Віцебску, Салігорску, Гомелі, Жодзіне, Лідзе — усяго сьцягі вывесілі ў пятнаццаці гарадах краіны.

#### Горадня

У **Віктара Сазонава** маёры міліцыі Ленінскага РУУС **Пётар Лянец** і **Іван Вечар** узялі тлумачэньні і склалі на яго адміністратыўны пратакол паводле арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавага мерапрыемства») за ўдзел у канцэрце польскага гурту Lombard. Сп. Віктар Сазонаў, маўляў, размахваў бел-чырвона-белым сьцягам. У той жа дзень паводле аналягічнага абвінавачваньня быў складзены адміністрацыйны пратакол паводле ч.3 арт. 23. 34 КаАП на старшыню абласной арганізацыі АГП **Юр’я Істоміна**, а раней — на кіраўніцу непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў у Беларусі **Анжаліку Борыс**.

#### Жодзіна

**Сяргей Парсюкевіч** адзначыў 41-шы дзень народзінаў за кратамі. Ягоныя сябры адправілі ў ізалятар у Жодзіна дзясяткі віншавальных паштовак. Прадпрымальнікі Смаленскага рынку Віцебску, дзе Сяргей два гады ўзначальваў прадпрымальніцкую раду, узялі шэфства над сям’ёй палітзьняволенага: штомесяц ёй аказваецца матэрыяльная дапамога. Нагадаем, С.Парсюкевіч быў асуджаны на 2,5 гады пазбаўленьня волі ў калёніі агульнага рэжыму нібыта за зьбіцьцё супрацоўніка Менскага цэнтру ізаляцыі праваўпарушальнікаў **Аляксандра Дулуба**.

#### Полацак

Судзьдзя Полацкага гарадзкога суду **Вікторыя Сьвітык** прысудзіла штрафы тром актывістам незарэгістраванага «Маладога фронту», затрыманым днём раней з расьцяжкай «Свабоду палітвязьням» каля помніка Скарыну. **Сяржук Каралёнак** і **Зьміцер Сакалоў** атрымалі штрафы 10 базавых велічыняў (350 тыс. руб.). **Алеся Круткіна**, якога за ўдзел у несанкцыянаваных акцыях сёлета затрымлівалі і судзілі ўжо чацьверты раз, аштрафавалі на 35 базавых велічыняў(1 млн 225 тыс. руб.).

Судзьдзя не задаволіла хадайніцтва А.Круткіна аб запрашэньні перакладчыка на беларускую мову. Падтрымаць сяброў у судзе прыйшлі й затрыманыя разам зь імі **Сяржук Глінскі** і **Мікалай Дземідзенка**. Іх паставілі на ўлік у адмысловую картатэку праваўпарушальнікаў.

#### Слонім

Сябар сойму Партыі БНФ **Іван Шэга** накіраваў заявы ў Слонімскую раённую, Гарадзенскую абласную і Рэспубліканскую пракуратуру з патрабаваньнем даць адказ аб законнасьці дзеяньняў КДБ у адносінах да яго і ягонай сям’і. Нагадаем, што кіраўнік Слонімскага міжраённага аддзяленьня КДБ **Аляксандар Мазалькоў** зьвярнуўся з пісьмовым запытам да загадчыка псыханэўралягічнага аддзяленьня раённага шпіталю Аляксандра Кандроўскага з прапановай правесьці праверку псыхічнага стану ўсіх грамадзкіх актывістаў, што дзейнічаюць у рэгіёне, і іхных родных у сувязі з «узьніклай неабходнасьцю». І.Шэга хоча ведаць, ці санкцыянавала дзеяньні КДБ пракуратура, ці праводзіліся ў адносінах да яго сям’і сьледчыя дзеяньні і наколькі такія дзеяньні адпавядаюць заканадаўству.

#### Няміга

Актывісты незарэгістраванага руху «Бунт» зладзілі на Нямізе акцыю, падчас якой раздавалі ўлёткі, а таксама прапаноўвалі даць адказ на пытаньне «Ці падобныя гэтыя людзі?», ацаніўшы партрэты Гітлера, Сталіна, Лукашэнкі: зь дзецьмі ды ў вайсковых строях. Праз некалькі хвілін акцыя была спынена міліцыяй, а тры яе ўдзельнікі адвезеныя ў РУУС. **Глеба Курцова**, затрыманага ў часе акцыі, і **Яраслава Сьцешыка**, які акцыю здымаў, зьвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы. **Зьмітра Е.** адпусьцілі без складаньня пратаколу. Назаўтра судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску **Бандарчук** прысудзіла **Я.Сьцешыку і Г.Курцову** па 5 сутак адміністрацыйнага арышту. Паводле прысутных у залі суду калегаў затрыманых, міліцыянты-сьведкі **А.А.Волкаў** і **Навічонак Е.Л.** блыталіся ў сваіх сьведчаньнях.

#### Гомель

У Гомелі на дахах трох будынкаў на цэнтральнай вуліцы вывесілі бел-чырвона-белыя сьцягі. Месьцічы маглі іх бачыць ад 7-й раніцы на вуліцы Савецкай — два зь іх да паўдня былі зьнятыя супрацоўнікамі міліцыі або камунальных службаў. Яшчэ адзін быў відаць да паловы на трэцюю.

### 16 траўня

#### Менск

**У Менску** прайшла традыцыйная акцыя салідарнасьці з палітвязьнямі. На Кастрычніцкай плошчы сабралася 60 чалавек. У кожнага ў руках былі партрэты палітвязьняў — **Андрэя Кіма**, **Аляксандра Казуліна**, **Сяргея Парсюкевіча**, а таксама партрэты зьніклых **Ганчара**, **Красоўскага**, **Захаранкі**, **Завадзкага**. Нікога не затрымалі. Актывісты грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь» выйшлі на галоўны праспэкт Менску з прымацаванымі да сьпіны партрэтамі палітвязьняў і тлумачэньнем да іх.

#### Салігорск

Моладзі не далі нават разгарнуць партрэты палітвязьняў. Затрымалі 5 чалавек, сярод якіх апынуліся адзін зь лідэраў Салігорскага незарэгістраванага «Маладога фронту» **Іван Шыла** з бацькамі, актывіст прадпрымальніцкага руху **Аляксандар Цацура**. Пазьней усіх адпусьцілі без складаньня пратаколаў. Тым часам **Хрысьціна Самойлава** зладзіла адзіночны пікет: яна прастаяла на цэнтральнай плошчы з партрэтамі палітвязьняў каля 20 хвілін.

### 21 траўня

#### Асудзілі завочна

15 траўня суд Першамайскага раёну Менску завочна асудзіў лідэра незарэгістраванага «Маладога Фронту» **Зьмітра Дашкевіча** і ягонага намесьніка **Артура Фінькевіча**. Судовы працэс адбываўся паводле пратаколу, складзенага на хлопцаў за ўдзел у акцыі «Дзень Эўропы», якую ладзілі сябры кампаніі «Эўрапейская Беларусь» 1 траўня 2008 года ля Нацыянальнай бібліятэкі. Раней за гэтую ж акцыю былі асуджаныя лідэр БСДГ **Мікола Статкевіч**. Пра вырак (7 сутак арышту) палітыкі даведаліся толькі ў сераду, атрымаўшы пастановы суду па пошце.

**СП**

# Зброя для тэрарыстаў



Інтэрпол пацьвердзіў аўтэнтычнасьць дадзеных з ноўтбукаў FARC.

Гаворка пра захопленыя на партызанскай базе кампутары, у якіх захавалася перапіска тэрарыстаў з прадстаўнікамі Чавэса і, у прыватнасьці, інфармацыя пра магчымыя пастаўкі ім зброі зь Беларусі. Павялічваецца імавернасьць таго, што Вэнэсуэлу, а заадно зь ёй і Беларусь зьвінавацяць у падтрымцы міжнароднага тэрарызму.

Інтэрпол пацьвердзіў аўтэнтычнасьць інфармацыі, знойдзенай у трох ноўтбуках, двух цьвёрдых дысках і трох флэшках, захопленых калюмбійскімі камандас у часе рэйду на базу партызанаў з Рэвалюцыйных узброеных сілаў Калюмбіі (FARC), што разьмяшчалася на тэрыторыі саюзнага з Вэнэсуэлай Эквадору.

Генэральны сакратар Інтэрполу Рональд Нобл паведаміў пра вынікі экспэртызы, праведзенай арганізацыяй. Яна ня выявіла ніякіх маніпуляцый са зьмесьцівам лэптопаў: экспэрты не знайшлі ніякай «мадыфікацыі, зьмены, дабаўленьня або выдаленьня» файлаў з дадзенымі на кампутарах і носьбітах інфармацыі. Адпаведны рапарт Інтэрполу складаецца з 102 старонак.

Вынік экспэртызы Інтэрполу — гэта сур’ёзны ўдар па рэпутацыі Чавэса, але таксама і Беларусі.

Зь перапіскі тэрарыстаў з Чавэсам вынікае, што Вэнэсуэла фінансавала герылью. Сума фінансаваньня магла скласьці нават 300 мільёнаў даляраў.

Эквадор удзельнічаў у гэтых таемных апэрацыях — дзіўна ўжо тое, што база партызанаў, якія на сёньня ўтрымліваюць у закладніках 700 чалавек, свабодна існавала на яго тэрыторыі.

Беларусь жа фігуруе ў матэрыялах лэптопаў як крыніца паставак зброі, прычым у лісьце да Рэеса гаварылася пра асабістую сустрэчу беларускага прадстаўніка з пасланцам тэрарыстаў.

Гішпанская газэта El Pais першай працытавала э-мэйл Івана Маркеса, лідэра Рэвалюцыйных узброеных сілаў Калюмбіі, датаваны 8 лютага: «Беларускі сябар прапанаваў рэалізаваць пакет на чорным рынку, каб пазьбегчы праблемаў. 17-га гэтага месяца ў Каракас прыедзе высокі прадстаўнік гэтага сябра, каб удакладніць сьпіс. Анёл папрасіў нас прысутнічаць, каб мы асабіста сустрэліся з дэлегатам. Гэта вельмі важна».

«Анёла» газэта расшыфроўвае як Чавэса. «Прадстаўніком сябра» ж лічыць Віктара Шэймана. «Шэйман быў адным з тых, хто прабіваў падпісаньня летась кантракты на пастаўку зброі ў Вэнэсуэлу на 720 млн эўра», — піша газэта.

Нагадаем, што 15—19 лютага адбыўся афіцыйны візыт у Вэнэсуэлу беларускай дэлегацыі на чале зь дзяржаўным сакратаром Рады Бясьпекі Віктарам Шэйманам.

Пацьверджаньне сувязяў Чавэса з FARC можа зашкодзіць ягоным пазыцыям як унутры краіны, так і за межамі. Паводле апытаньняў, 90% вэнэсуэльцаў асуджаюць дзейнасьць FARC. Калюмбійская герылья ўнесеная ў амэрыканскі і эўрапейскі сьпісы міжнародных тэрарыстычных арганізацый.

FARC вядзе партызанку ўжо 40 гадоў. На пачатку за FARC стаяла баявое крыло Кампартыі, але з часам, калі стала відавочна, што FARC скацілася да наркагандлю і бандытызму, камуністы разарвалі з крывавай групоўкай.

Вэнэсуэла настойвае, што файлы, здабытыя Калюмбіяй, фальшывыя.

Дзяржаўны сакратарыят бясьпекі Беларусі назваў публікацыю ў El Pais «домысламі». Прадстаўнікі Рады Бясьпекі спаслаліся на папярэджаньні Чавэса, які казаў, што Злучаныя Штаты арганізуюць укіданьне ў СМІ такога кампрамату, каб дыскрэдытаваць кіраўніцтва Вэнэсуэлы.

Вынікі экспэртызы Інтэрполу ставяць пад сумнеў абвяржэньні Чавэса і беларускага боку, і Беларусь можа трапіць у няпростае становішча на міжнароднай арэне, бо разам з Вэнэсуэлай наша краіна можа трапіць у сьпіс дзяржаваў-спонсараў тэрарызму.

Прэзыдэнт Вэнэсуэлы Уга Чавэс ужо назваў заяву Інтэрполу «клаўнадай». Ён так пракамэнтаваў гэтую інфармацыю: «Доказы? Ды кожны юрыст-першакурсьнік ведае, што ніякія гэта ня доказы. Гэта нічога не даказвае!»

**Мікола Бугай**



# У М’янме як у «Рыбіным горадзе»

Хунта М’янмы абвесьціла, што 99% выбарцаў узялі ўдзел у рэфэрэндуме аб зьменах у Канстытуцыі, і 92% прагаласавалі «за». Пры гэтым чвэрць краіны ляжыць у руінах пасьля паводкі, а трупы дзясяткаў тысяч людзей застаюцца нязнойдзенымі.

У рамане Наталкі Бабінай «Рыбін горад» Цэнтравыбаркам абвесьціў аб пераканаўчай і элегантнай перамозе дыктатара, нягледзячы на тое, што ў дзень выбараў над краінай віраваў сьмяротны ўраган. Амаль даслоўна тое самае адбылося ў М’янме (Бірме).

Каб правесьці аддаўна прызначаны «рэфэрэндум», які мае ўвекавечыць кіраваньне вайсковай хунты, улады краіны абмежавалі нават міжнародную дапамогу ахвярам цыклёну «Наргіз», адмовіліся пускаць у краіну ратаўнікоў і дактароў і спынілі допуск замежнікаў у раёны катастрофы. Каб крый Божа не пратачылася лішняя інфармацыя з краіны і ў краіну.

Нягледзячы на тое, што Індыя папярэдзіла генэралаў пра набліжэньне стыхіі за два дні, залевы засталі м’янмарцаў зьнянацку. У выніку загінулі каля 120 тысячаў чалавек, 2,5 мільёны засталіся бяз даху над галавой і сродкаў для існаваньня. За два тыдні іх становішча мала палепшала: як перадаюць з М’янмы дыпляматычныя крыніцы, у зоне стыхійнага бедзтва пачынаюцца эпідэміі, людзям бракуе пітной вады, ежы, намётаў. Тым часам на краіну насоўваецца новы ўраган.

І вось учора радыё М’янмы абвесьціла, што 99% выбарцаў прыйшлі на ўчасткі, а 92% зь іх прагаласавалі за новую канстытуцыю.

Цяжка паверыць у такую масавасьць галасаваньня ў краіне, чвэрць якой ляжыць у руінах пасьля стыхіі, а яшчэ чвэрць складаецца зь цяжкадаступных раёнаў. Цяжка паверыць і ва ўсенародную падтрымку генэралаў у краіне, якая на апошніх свабодных выбарах аддала абсалютную большасьць галасоў дэмакратычнай апазыцыі і дзе ўсяго паўгоду таму ўлады расстралялі шматтысячныя маніфэстацыі пратэсту. Сапраўды, хлусьня дыктатараў ня мае межаў.

ААН і міжнародныя арганізацыі працягваюць беспасьпяхова дабівацца ад уладаў М’янмы дазволу арганізаваць маштабную гуманітарную дапамогу пацярпелым рэгіёнам. Улады М’янмы лічаць, што празьмерныя кантакты са сьветам разбуральна ўзьдзейнічаюць на грамадзянаў краіны.

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### Наклад пад нож за Лукашэнку-малодшага

У патрэбны тэрмін не прыйшоў да чытачоў чарговы нумар незалежнай газэты «Борисовские новости». Справа ў тым, што выданьне пастаянна друкавалася ў менскай тыпаграфіі «Плутас-Маркет», але на гэтым тыдні тыпаграфія пераяжджала, таму не пасьпела своечасова ўсталяваць друкарскі станок. Дамовіліся на друк зь іншай тыпаграфіяй. Дырэктар яе паставіў адзінай умовай, каб матэрыялы нумару мелі «нэўтральны характар». Але ў сераду начальнік тыпаграфіі заўважыў у газэце невялікую нататку пра Лукашэнку-малодшага. Ён адразу запатрабаваў ад Букаса, каб гэты матэрыял быў зьняты з паласы. У выніку напалову надрукаваны наклад пойдзе пад нож. Чытачы «...новости» ўсё ж атрымаюць. Газэта была надрукаваная ў пятніцу ў «Плутас-Маркеце». Прычым, з нататкай пра Мікалая Лукашэнку.

### АЭС пабудуюць між Горкамі і Шкловам

Кукшынаўская пляцоўка найлепш надаецца для зьмяшчэньня Беларускай АЭС, паведаміў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА старшыня Акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч. На другое месца камісія паставіла Астравецкую пляцоўку, а на трэцяе — Краснапалянскую (Чавускі раён).

### Разьбіўся паветраны шар

16 траўня ў вёсцы Сёмкава пад Менскам упаў і ўзарваўся паветраны шар, у кашы якога былі прадпрымальнік, яго сяброўка з дачкой ды інструктар. Два пасажыры аэрастату (прадпрымальнік з сяброўкай) загінулі на месцы, яшчэ два (дачка і лётчык) цудам ацалелі. Мяркуецца, што інцыдэнт здарыўся праз дождж і парывісты вецер. Аэрастат ударыўся аб дах вясковай хаты, пасьля ўрэзаўся ў дрэва. Гэта й выратавала пілёта й васьмігадовую дзяўчынку. Ад полымя палілкі адзін за адным пачалі выбухаць газавыя балёны. Апошнія ледзь не забілі людзей, якія кінуліся на ратунак. Палёт на цеплавым аэрастаце быў падарункам маладой жанчыне на дзень нарададжэньня. Ён ня быў заплянаваны. Проста сям’я праяжджала міма Менскага мора й пабачыла прыгожы паветраны шар.

**ЗП; МБ**

# Гэта ня Рыё-дэ-Жанэйра!



REPORT.TRAVEL.RU

**У фавэлах — бедных прыгарадах, архітэктурная фантазія проста крынічыць: там людзі жывуць у будынках з кардону або з плястыкавых бутэлек.**

Гэтым разам не фэльетон, а падарожныя нататкі Лёліка Ушкіна.

Пабываўшы ў Бразыліі, праверыў на праўдзівасьць самыя папулярныя ў беларускім грамадзтве міты аб гэтай краіне.

### Дзе тут у вас тайга?

Міт першы: малпы на дрэвах. Ацэнка — лухта. Шчыра кажучы, нават папугая ня бачыў. І адкуль ім узяцца ў Сан-Паўлу — адным зь дзесяці найбуйнейшых гарадоў плянэты. Сумарна з прыгарадамі тут пражывае больш за 20 млн чалавек. Гарадзкі ляндшафт нават у цэнтры ўяўляе зь сябе пэйзажы Малінаўкі або Серабранкі — «дамы-каробкі». Ёсьць яшчэ фавэлы — бедныя прыгарады, дзе архітэктурная фантазія проста крынічыць: там людзі жывуць у будынках з кардону або з плястыкавых бутэлек. Як бачым, малпам тут ніяк не разгарнуцца. Прыматы галоўным чынам жывуць на поўначы, у Амазоніі. Фраза «А вы былі на Амазонцы?» выклікае ў мясцовага насельніцтва шок. Гэта тое ж самае, што спытаць у жыхара Масквы «Дзе тут у вас тайга?». Большасьць з нармальных бразыльцаў ніколі малпаў і іншых дзікабразаў у прыродзе ня бачылі і бачыць ня хочуць. Вояж на Амазонку дастаткова дарагі, акрамя таго, напярэдадні трэба зрабіць процьму ўсякіх прышчэпак.

### Слановая хвароба

Пабываўшы ў Бразыліі, разумееш, што трапічныя хваробы — гэта ня жартачкі. Напрыклад, на вуліцах Сан-Паўлу лёгка можна сустрэць людзей, хворых на «слановую хваробу» — у выніку ўкусу маскіта ў арганізм трапляе лічынка, якая і павялічвае часткі цела да гіпэртрафічнага памеру. Пабачыш жанчыну з далоньню памерам з манітор і думаеш: ну яе да д'ябла, тую Амазонку зь яе малпамі.

### Футбол

Міт другі: футбол. Ацэнка — праўда. Давялося пабачыць футбольную ліхаманку ў рэальнасьці. Мясцовы «Палмэйрас» гуляў у фінале чэмпіянату штату зь нейкім клюбам з правінцыі. Не магу не згадаць гістарычнага кур'ёзу: «Пальмэйрас» быў заснаваны як клюб італьянскіх эмігрантаў і меў назву «Паўліста Італія», пакуль на пачатку 1940-х гадоў урад Бразыліі не далучыўся да антыгітлераўскай кааліцыі. Адмысловым дэкрэтам усе клюбы, якія мелі ў назвах словы «Італія», «Нямеччына», «Гішпанія», былі перайменаваныя, каб унікнуць палітычнага падтэксту. Дык вось, Сан-Паўлу ў дзень матчу нагадваў Менск напярэдадні буйнай вылазкі апазыцыі: паўсюль мянты, бранявікі, у небе нават верталёты. Як толькі бела-зялёныя (колеры «Палмэйраса») закалацілі першую штуку, пачаўся нейкі фэст. Увесь горад быццам выбег на двор. Сталі махаць сьцягамі, пускаць фаервэркі, абдымацца ды танчыць. Нехта ў прыпадку эмоцый крышыў аўтамабілі і кідаў камянюкі ў паліцыю. Спэцназ у адказ пачынаў труціць хуліганаў нейкім каляровым газам. Адным словам, горад адрываўся.

Бразыльцы, дарэчы, вельмі азартныя людзі. На ўсю краіну існуе толькі тры казіно. Аднак час ад часу, прыкладна раз у пяцігодку, урад легалізуе дзейнасьць казіно, але толькі на адзін год. Прычым з умовай, што будынкі казіно па заканчэньні году аўтаматычна пяройдуць у дзяржаўны фонд.

### Рабыня Ізаўра

Міт трэці: рабыня Ізаўра. Ацэнка — праўда. Бразыльянкі-мулаткі вельмі прыгожыя. Мяшанка нацый тут, дарэчы, самая неймаверная. Для даведкі: у Сан-Паўлу жыве больш італьянцаў, чым у Мілане альбо Рыме. Пра беларусаў нічога ня чуў, а польская і ўкраінская грамады дастаткова актыўныя.

Цікавая гісторыя зьвязаная з украінцамі. Калі першы карабель з эмігрантамі з Галіччыны прыплыў у бухту Рыё-дэ-Жанэйра, улады былі вельмі напалоханыя выглядам пасажыраў. Узьнікла вэрсія, што гэта партыя зь нейкай нецывілізаванай краіны. На ўсякае ўсё пастанавілі мігрантаў хрысьціць, хоць, як вядома, заходнія ўкраінцы і так зацятыя каталікі.

Усе этнічныя меншасьці, якія складаюць бразыльскую нацыю, жывуць у абсалютным суладзьдзі. Хоць у календары дзяржаўных сьвятаў ёсьць такое экзатычнае, як «Дзень падтрымкі нэграў», але ніякіх праяваў расізму не заўважыў. Для зносінаў бразыльцы выкарыстоўваюць партугальскую мову, прычым у нейкім супэрпрымітыўным фармаце. Цікавая рэакцыя саміх партугальцаў на фэномэн бразыльскай партугальскай мовы: спачатку яны проста затыкалі вушы, каб ня чуць мясцовай трасянкі, аднак пасьля, здаецца, зразумелі, што, чым прасьцей, тым у эпоху інтэрнэту лепш. Прынамсі, крытыкі рэформы партугальскай мовы, рашэньне пра якую нядаўна было прынятае ў парлямэнце Партугаліі, лічаць, што аўтары праекту закону, па сутнасьці, проста кадыфікавалі бразыльскі варыянт граматыкі мовы Луіша ды Камоэнса.

### Край ночы

Міт чацьверты: генэралы пясчаных кар'ераў, або вулічны крымінал. Ацэнка — праўда. «Сан-Паўлу — адзін з самых небясьпечных гарадоў сьвету, горад злачынства, поўны прастытутак, наркотыкаў, брудных грошай і карупцыі» — гэта анатацыя да фільму «Падарожжа на край ночы» рэжысэра Эрыка Ізона, які я дзеля забавы паглядзеў напярэдадні падарожжа. Шчыра кажучы, ні наркотыкаў, ні злачынства ў Сан-Паўлу ня бачыў, аднак сама атмасфэра вельмі напружаная. У гатэлях даюць прачытаць інструкцыю, што рабіць, калі на вуліцы вам нехта прыставіць да галавы рулю. Прыкладна раз на 10—15 хвілінаў за акном енчыць паліцэйская сырэна. Усе машыны інкасатараў — звычайныя бранявікі. Цэнтар гораду патрулююць паліцэйскія розных дэпартамэнтаў: муніцыпальная паліцыя, мабільная паліцыя, нейкая гвардыя. Ёсьць нават маральная паліцыя. Што яна робіць, праўда, не разумею.

Знаёмы хадзіў глядзець мясцовы стрыптыз. Прыйшоў усхваляваны: стрыптыз закончыўся банальным спарваньнем паміж мужчынам і жанчынай у нейкай акрабатычнай позе. Прычым усё было вельмі брудна, неяк паўсядзённа. Калі нехта з залі закрычэў, каб акрабат-стрыптызэр дарабіў сваю справу з акрабаткай да фіналу, той адказаў: «Што я, дурны? У мяне сёньня яшчэ тры выступы!» Калі ўжо гэта ня лічыцца парушэньнем маралі, то што тады ёсьць парушэньне? Ва ўсякім разе тут усе засталіся жывыя-здаровыя.

А іншаму знаёмаму не пашанцавала: ён, новы рускі, захацеў зрабіць прамэнад у традыцыйным для яго клясы выглядзе — зь велізарным срэбным крыжам. Як толькі выйшаў з гатэлю, яму на шыю павіс малалетка. Дзякаваць Богу, побач быў паліцэйскі. Ён даў беспрытульніку дзяржаньнем пісталета па кумпалу. Праўда, таксама на аўтамаце крэпка засадзіў тым самым дзяржаньнем па галаве інтурыста.

### Ніякіх белых штаноў

Міт пяты: усе ў белых штанах. Ацэнка — хлусьня. Першы чалавек у белых штанах, якога я пабачыў у Бразыліі, быў бомж. Я сядзеў у кавярні — у кожным квартале ёсьць свая кавярня, дзе вечарам зьбіраецца тусьняк, — калі туды зайшоў чалавек у белых штанах і папрасіў агеньчыку. Белыя штаны былі адзіным прадметам ягонага ўбраньня. Нават ботаў у яго не было.

Такіх белаштанікаў у Сан-Паўлу да халеры. Яны жывуць проста на вуліцах. Відовішча, асабліва калі мова ідзе пра дзяцей і жанчын, жудаснае. Як гэтыя кляшары выжываюць, незразумела. Магчыма, за кошт таннай садавіны.

Цэны ў Сан-Паўлу не слабыя: праезд у мэтро — паўтара бакса, пляшка піва 0,33 — бакс.

Сацыяльнае пытаньне ў Бразыліі настолькі актуальнае, што няма нічога дзіўнага ў тым, што галоўнымі палітычнымі канкурэнтамі тут зьяўляюцца Партыя працы і Сацыял-дэмакратычная партыя. Цікавым мне падалася ідэя мэрыі — забараніць усю вонкавую рэкляму ў горадзе. Нават у Менску больш рэкламы, чым у галоўнай мэтраполіі Бразыліі. Айцы гораду кажуць, што такім чынам яны заглушаюць пачуцьцё клясавай нянавісьці ў бедных людзей: вывы на рэклямных бігбордах багатых прыгажунь і шыкарных мэрсаў часта штурхаюць іх да экспрапрыяцыі экспрапрыятараў.



BUSINESS.RU

**Рэкламы тут менш, як Менску: такім чынам заглушаецца пачуцьцё клясавай нянавісьці ў бедных людзей.**

# Сацыяльная і палітычная філязофія ў ЭГУ

**Праграма «Сацыяльная і палітычная філязофія»** арыентавана на падрыхтоўку бакаляўраў філязофіі ў адпаведнасьці з найноўшымі тэндэнцыямі развіцьця філязофскіх ведаў і адукацыі. Праграма працягвае адукацыйныя і дасьледчыя традыцыі, якія склаліся на факультэце філязофіі ЭГУ ў Менску, і адначасова адкрывае новы кірунак філязофскай адукацыі ў рэгіёне. З аднаго боку, студэнты атрымліваюць грунтоўную падрыхтоўку ў галіне клясычнай філязофіі, зь іншага, у рамках спэцыялізацый па палітычнай і сацыяльнай філязофіі, засвойваюць найноўшыя тэндэнцыі развіцьця філязофскіх ведаў у іх дачыненьні да сацыяльных, палітычных і культурных праблем.

На 1—2 курсах асноўная ўвага аддаецца традыцыйным філязофскім курсам, падчас якіх студэнты засвойваюць клясычныя і сучасныя мадэлі аналізу філязофскіх тэкстаў, авалодваюць філязофскай тэрміналёгіяй і набываюць навыкі крытычнага мысьленьня.

На 3—4 курсах студэнты спэцыялізуюцца ў адным з двух кірункаў праграмы: ***палітычная філязофія*** і ***сацыяльная філязофія***.

Падчас навучаньня студэнты
— набываюць прафэсійныя веды ў галіне гісторыі філязофіі і сучаснай сацыяльнай і палітычнай філязофіі;
— вывучаюць дзьве клясычныя (старажытнагрэцкую, лаціну) і дзьве сучасныя замежныя мовы (ангельскую + нямецкую або францускую на выбар);
— набываюць шэраг навыкаў, неабходных для пасьпяховай прафэсійнай дзейнасьці ў сучасных умовах: уменьне працаваць са складанымі тэкстамі (у тым ліку іншамоўнымі), знаходзіць і аналізаваць навуковую інфармацыю; уменьне аргумэнтавана выкладаць і адстойваць у дыскусіі сваю пазыцыю; здольнасьць да бесьперапыннай самаадукацыі, засваеньня новых сфэр дзейнасьці і адаптацыі да дынамічных патрабаваньняў сучаснага рынку працы.

Выпускнікі змогуць выкарыстоўваць свае веды ў наступных сфэрах прафэсійнай дзейнасьці:
— вышэйшая адукацыя і навука;
— сацыяльна-палітычная аналітыка;
— палітыка і адміністраваньне сацыяльнай і культурнай сфэр;
— пераклад гуманітарнай літаратуры.

Вучэбны працэс забясьпечвае высокакваліфікаваны міжнародны калектыў выкладчыкаў зь Беларусі, Літвы і шэрагу краін Заходняй Эўропы і Паўночнай Амэрыкі. Шырокае міжнароднае супрацоўніцтва і трансфэрт крэдытаў дазваляюць студэнтам гарманічна спалучаць навучаньне ў ЭГУ з навучаньнем ва ўнівэрсытэтах СНД, Заходняй Эўропы і Паўночнай Амэрыкі. Выпускнік атрымлівае дзяржаўны дыплём Літоўскай Рэспублікі, прызнаны ў краінах ЭС. Праграма прапануецца як у *дзённым*, так і ў *завочным* фармаце.

**Кантакты**
Дзённае навучаньне: **dept.philosophy@ehu.lt**
Завочнае навучаньне: **phildistance@ehu.lt**

На ўсе Вашыя пытаньні Вы атрымаеце адказы ад кіраўніка праграмы і студэнтаў ЭГУ на форуме http://www.ehunity.org



**Флявія Мюлер Мэдэйрас (Flavia Muller Medeiros). Бяз назвы (групавое фота студэнтаў ЭГУ ў выгнаньні). Належыць Цэнтру сучаснага мастацтва, Вільня.**

## Сэкцыя «Мэмарыял» Таварыства аховы помнікаў патрабуе вызваленьня Хурсіка

**Заява**

Мы абураныя затрыманьнем і 15-суткавым арыштам вядомага выдаўца Віктара Хурсіка. Гэта расправа за друкаваньне праўды пра падзеі апошняй вайны, у тым ліку пра зьверствы партызанаў над мірнымі грамадзянамі, як у вёсцы Дражна Старадарожскага раёну 14 красавіка 1943 г.

Нагадаем, што памяць 25 жыхароў вёскі была ўшанавана 19 красавіка ўсталяваньнем і асьвячэньнем крыжа Сьв. Эўфрасіньні Полацкай.

На жаль, гэты крыж быў дэмантаваны, а ўдзельнікі ўшанаваньня памяці закатаваных беларусаў сутыкнуліся з жорсткімі рэпрэсіямі з боку ўладаў. Трэба спыніць гэты праваВое бязладзьдзе.

Цяпер ня змрочны час сталінізму, а XXI стагодзьдзе.

Таму мы патрабуем:
— аднаўленьня і паўторнага асьвячэньня крыжа Сьв. Эўфрасіньні Полацкай на могілках у в. Дражна Старадарожскага раёну.
— неадкладнага вызваленьня Віктара Хурсіка.
— спыненьня пераследу іншых удзельнікаў усталяваньня крыжа 19 красавіка,
— прыцягненьня да адказнасьці кіраўніцтва Старадарожскага райвыканкаму, міліцыі, суду за грубыя парушэньні беларускага заканадаўства і зьдзекі з нацыянальных традыцый і народнай памяці беларусаў.

Мы зьвяртаемся да Філарэта, Мітрапаліта Менскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсея Беларусі з просьбай аб патрымцы гэтых патрабаваньняў.

**Прынята на паседжаньні сэкцыі «Мэмарыял» БДТАПГК 15.05.2008**

## ВОДГУКІ

### Радыёстанцыі працуюць, а не вяшчаюць (№18)

Пакрыцьцё ФМ — гэта 40—50 км. Вяшчаньне на Беларусь можна зрабіць на сярэдніх хвалях.

**S.V.Yozh**

***

Бясконца цікава ведаць, чаму ў мінулым годзе віленскі перадатчык 612 кгц (сярэднія хвалі) трансьляваў з 8 да 9-й раніцы «Эўрарадыё», а зь 9 да 10 гадзінаў «Рацыю», а цяпер не? Можна было слухаць у Нясьвіжы, напрыклад. Яшчэ адзін перадатчык таксама на сярэдніх хвалях вечарамі трансьляваў «Рацыю». Нешта даўно не чуваць «Балтыйскую хвалю». У той жа час «Эўрарадыё» вядзе трансьляцыю праз «Сырыюс» і «Хотбёрд». Але талеркі ў людзей для тэлевізіі найперш стаяць. Нават радыё «Свабода» працуе цяпер на значна горшых перадатчыках, чым некалькі гадоў таму... Ня трэ баек пра інтэрнэт як спосаб слухаць радыё ці глядзець «Белсат». Гэта прыблізна тое самае, калі б галоўны рэдактар «Народнай волі» зачытваў ахвотным артыкулы праз мабільнік. Радыё і тэлевяшчаньне незалежных станцый — бяда. Мусяць павялічыць вяшчальныя магчымасьці.

**Марконі**

***

На замежных радыё толькі і звону, што пра апазыцыю. А народ жа не жыве з думкаю пра апазыцыю. У яго свае праблемы.

**Карэспандэнт**

***

Нехта, выклікаючы скандал, намагаецца падарваць давер да радыё акурат тады, як яно нарэшце пачало вяшчаць на ФМ на Горадню. Дзякуй богу, польскае МЗС не ўспрымае сур'ёзна пратэстоўцаў — студэнт-другакурсьнік хоча вызначаць дырэктараў станцыі.

**MrFM**

### «Што зь Нясьвіжам вырабілі» (№18)

Глядзець на гэтыя фатаздымкі — як шылам па целе, каб паміраў і дрыгаўся ад болю, пакуль паміраеш! У мяне ёсьць сябры, якія баяцца туды езьдзіць, каб ня страціць прытомнасьць ад убачанага, бо ва ўспамінах засталося ня гэтае страхоцьце, а замак з цудоўнай барокавай гадзіньнікавай вежай над люстрам азёраў. За 400 гадоў ніякая армія не змагла так разбурыць замак, як гэта адбываецца цяпер. Што гэта за спэцыялісты? Ня маюць да беларускай спадчыны ніякай павагі...

**Зьміцер Савельеў, архітэктурны факультэт БНТУ**

***

Глядзець бязь сьлёз немагчыма. Радзівілы ў трунах папераварочваліся. Рабіць тэрмінова нешта трэба.

**К-я**

***

Глядзеў учора рэпартаж на БТ, таксама ў «СБ» чытаў — зрэагавалі, заварушыліся... Крытыкавалі будаўнікоў, пра галерэю разбураную сказалі... І паказалі трохі адрэстаўраваныя інтрэр'еры...

**Узрэцкі**

### «Белсат»: усё яшчэ наперадзе (№18)

Нам патрэбны найперш агульнадаступны «Белсат», хай напачатку сыры, недасканалы, але каб абавязкова прымаўся сотнямі тысяч талерак, каб яго наяўнасьць была фактарам беларускай інфапрасторы, сьведчаньнем таго, што можа быць масавы непадкантрольны мэдыярэсурс. Каб абім пайшла пагалоска ў грамадзтве.

**Vagant**

***

Згодзен з тым, што не хапае праграмаў «на такія ўнівэрсальныя тэмы, як здароўе, спорт ці аўтамабілі». Ад сябе дадам, што не хапае яшчэ проста цікавых мульцікаў з беларускім дубляжом, а то дзяцей ад «Jetix» не адагнаць. Ня ўсё так гладка, не хапае навінаў і аналітыкі. Мала дынамікі. Але ж гэта толькі пачатак... Наконт недаступнасьці. Патрэбен адзін дадатковы канвэртэр, скіраваны на Astra, і прыйдзецца замяніць дысек, наладзіць рэсывэр. Яшчэ сякая-такая дробязь. Гэта ўсё. Няўжо гэта так недаступна? Аразу скажу, што калі ўсталяваныя тры канвэртэры, то чацьвёрты ставіцца без праблемаў. Калі набываеш новую антэну, то ўсе налады і ўсталёўкі зробіць спэцыяліст, трэба толькі заплаціць дадатковых 10 даляраў.

**А-а**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага абʼёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

# Мы, беларусы, — мірныя людзі…




17 траўня на малой сцэне Купалаўскага давалі «Дзікае паляваньне караля Стаха». Гэтая пастаноўка — з тае катэгорыі, калі кветкоў не купіць і праз тры гады пасьля прэм'еры. Усё ў ёй адпачатна разьлічана на посьпех. Перадусім, літаратурная аснова — аповесьць Караткевіча. Піша **Аляксандар Фядута**.

На такія спэктаклі ходзіш з унутраным трымценьнем — баючыся расчаравацца. Аднак расчараваньне не прыйшло (што ўжо само па сабе добра). Наадварот, ужо зь першых хвілінаў стала зразумела, што схадзіць — варта было.

Вядома ж, рэжысэру Ўладзімеру Савіцкаму давялося шмат чым ахвяраваць у сюжэце Караткевічавай аповесьці. Малая сцэна не дапусьціла б таго стоўпатварэньня, да якога непазьбежна прывялі б спробы паставіць і баль з шматлікімі гасьцямі, і пагоню з тупатам дрыкгантаў. Дый амаль даслоўная перадача тэксту вялікай, з процьмай пэрсанажаў аповесьці скончылася б няўдачай — іншы ж бо від мастацтва. Але ў гэтым і не было патрэбы: «чацьвертая сьцяна» паміж акторамі і глядацкай заляй, як мы змаглі пераканацца, мае выключна ўмоўны характар, а таму нават тыя гледачы, хто не патрапіў папярэдне пазнаёміцца з хрэстаматыйным тэкстам, цалкам змаглі пазнаёміцца з галоўным — з той таямнічай атмасфэрай, якая і дазволіла рэжысэру вызначыць жанр спэктаклю як «псыхалягічны дэтэктыў».

Пытаньне пра тое, чаму Савіцкі абраў для свайго спэктаклю менавіта малую сцэну, адвалілася нейк адразу. Галоўнае ў гэтай дзеі — ня вонкавыя эфэкты (хоць і да іх мы яшчэ вернемся), а глыбокі псыхалягізм акторскай ігры. На вялікай сцэне вочы разгледзець шматкроць цяжэй. А, да прыкладу, вочы апошняй Надзеі роду Яноўскіх (Ганны Хітрык) — проста цудоўныя. Сьмяецца яна ці то плача, задумваецца над трагічным лёсам свайго роду ці то пакутуе, нават не спрабуючы вымавіць словаў каханьня, — вочы жывыя, жаласныя, пранізьлівыя. Пры гэтым яна можа спалучаць у сваёй Надзеі адначасова дзіцячае і жаночае — і рэч тут нават ня ў лялцы — двайніку самой Надзейкі, зь якой гаспадыня Балотных Ялін не разлучаецца. Няма ў ёй той выдуманай субтыльнасьці, якая ўзьнікае ў сьвядомасьці кожнага чытача з думкаю пра нявестаў з пазамінулага стагодзьдзя. Яна цалкам зямная — і зразумела, чаму яе кахаюць і Беларэцкі, і Варона. Дзіця шкадуеш, жанчыну кахаеш.

Хораша грае Андрэй Беларэцкі (2:0 на карысьць Рамана Падалякі). Ён нідзе не перацягвае глядацкую ўвагу на сябе, выяўляючы цудоўныя партнэрскія якасьці. І — вельмі розны. Адзін ён — з Ахмістрыняй (Юлія Міхневіч), другі — зь Берманам (Аляксандар Паўлаў), трэці — з Рыгорам (Зьміцер Ясяневіч). Іх дуэты сьлед глядзець вельмі ўважліва, услухоўваючыся ў інтанацыі, сочачы малюнак ролі.

Але галоўнымі ў гэтым спэктаклі робяцца не станоўчыя, а адмоўныя героі. Урэшце, пастаноўка — пра Вялікае Зло. Нездарма ж галоўны вобраз, на якім акцэнтуе ўвагу пастаноўшчык, — вобраз пацучынага царства, якое пануе навокал. Пра людзей, якія жаруць адно аднаго, нібы пацукі, пастаянна гаворыць Надзея Яноўская. Тупат ножак маленькага чалавека Балотных Ялін — нападоб лёгкага тупату пацучыных полчышчаў, якія гойсаюць пад падлогай. Адмоўныя пэрсанажы нават плястычна аказваюцца багацейшыя за станоўчых: да прыкладу, Ахмістрыня ў вельмі дакладным выкананьні Юліі Міхневіч, нават па сьцяне спускаецца, нагадваючы ці то пацука, ці то кажана, ці то Дракулу, якога сыграў Гэры Олдмэн у фільме Копалы (магчыма, мне гэта здалося, і на маім успрыманьні толькі адбіваецца ўплыў Андрэя Расінскага, які нейк за кубачкам кавы прачытаў мне лекцыю пра ўплыў эстэтыкі фільму жахаў на экранізацыю Караткевіча). А ўжо зьяўленьне дзядзькі Грыня Дубатоўка (мушу зьняць капялюш перад Алегам Гарбузам, які грае на найтанчэйшых нюансах) — тут наагул маем амаль што Мышынага караля з казкі Гофмана — проста зьяўляецца з-пад масьніцаў такое вялізнае, шэрае, бр-р-р!

Рэжысэр патрапіў выявіць глыбокі філязофскі сэнс Караткевічавай аповесьці. Зло — яно ня вонкавае. Яно хатняе. Як пацук жыве ў падпольлі, так зло жыве ў кожным зь людзей і пры першай прыдатнай нагодзе пазірае скрозь маску, з марай сьцягнуць з сабой назад, пад масьніцы, жаданы кавалак чужога шчасьця, а калі здолее — то і жыцьця. Але пры гэтым Уладзімер Савіцкі не забываецца, што мае справу з чыста беларускім матэрыялам. Гэта такі «Дракула» — але прачытаны і інтэрпрэтаваны, скажам, Адамам Мальдзісам. І, гледзячы на сцэну, чамусь пачынаеш задаваць сабе балючае пытаньне:

Мы, беларусы, — мірныя людзі…

хіба гэта пра нас? Гэта ж так не падобна на тых беларусаў, якіх бачым мы ў «Дзікім паляваньні». Хіба Дубатоўк і Варона — мірныя? Хіба мірны Рыгор, які зьедліва пасьміхаецца з гараджаніна Беларэцкага і зухавата гуляе пры гэтым ножычкам? А нават кніжны чарвяк Берман, летуценьнік-здраднік, нават Беларэцкі, які хапае за горла то аднаго, то іншага хатняга ворага каханай, — мірныя? Ня мірныя яны, вой, ня мірныя…

А вось зло ў пастаноўцы Савіцкага — хатняе, ласкавае. Яно ня шчэрыць дробныя вострыя зубы — яно ўсьміхаецца. Гляньце, напрыклад, у вочы Алесю Варону (Андрэй Гладкі), калі ён упершыню бачыць Беларэцкага і адчувае ў ім суперніка. Ён, вядома ж, ня плача кракадзілавымі сьлязьмі, але ад гэтага замілаванага погляду ніякавее нават глядач. Услухайцеся ў інтанацыі Алега Гарбуза: ягоны Дубатоўк сапраўды любіць сваю падапечную Надзейку, пяшчотнай і жарснай бацькоўскай любоўю любіць — проста так і зьеў бы яе ад свайго шчырага пачуцьця! Дый Ахмістрыня зь відавочным гонарам кажа, што служыць найлепшаму роду, — хоць нават і магла б зьвесьці Яноўскіх дазваньня. Адным словам, перамагчы зло можна толькі тады, калі ты адпачатна здолееў перамагчы яго ў самім сабе. Што праўда, рамантык Караткевіч вызваліў ад гэтага цяжкага абавязку двух галоўных герояў аповесьці (Беларэцкага і Яноўскую), але праз такое аўтарскае рашэньне ідэя ня робіцца менш актуальнай.

На галоўную ідэю ў пастаноўцы працуе ўсё — і акторская плястыка (заслуга Яўгеніі Кульбачнай), і кожны гук (Павал Захаранка падабраў гранічна дакладную музыку), і сцэнаграфія Віктара Цімафеева. Дашчаная згнілая падлога, якая літаральна ў нас на вачах распадаецца; пад ёй заўсёды нешта рухаецца, нехта варушыцца. Туды ж, у падпольле, як у бездань, падае-памірае Алесь Варона — з жудасным крыкам, нібыта сыходзячы ў пекла. На дзіва дакладна прадуманае і асьвятленьне: промні пражэктараў ці то робяць асьляпляльную сцэну, якая замест сьвятла хавае ад нас актораў, ці то імітуюць языкі полымя, якія паглынаюць грэшнікаў. Глядач у патрэбны момант (скажам, у сцэне двубою Беларэцкага і Вароны ў сутарэньні) трапляе ў цемру стагодзьдзяў — у літаральным сэнсе гэтага выразу. А разрыў (не антракт, але менавіта разрыў, абазначаны нечаканым усплёскам сьвятла) паміж дзеямі проста ашаламіў частку глядацкае залі.

Пасьпяховая тэатральная адаптацыя аднаго з найскладанейшых аўтараў беларускае літаратуры вымушае мяне як гледача выказаць запаветную надзею: можа, калісь мы пабачым і спэктакль паводле «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Маем неабходны драматычны сюжэт, маем рэжысэраў, якія валодаюць густам да добрай літаратурнай асновы і досьведам падобных літаратурна-тэатральных экспэрымэнтаў. І маем добрых (вельмі добрых!) актораў Купалаўскага тэатру, якія любяць і ўмеюць пераўвасабляцца.

Думаецца, гэта яшчэ наперадзе. Будзем мець надзею, што Купалаўскі, які шчэ не застыў у сваім акадэмізьме, выявіцца дастаткова мабільным, каб пайсьці зь цягам часу і на такую авантуру.

**Аляксандар Фядута, глядач**

# Алег Хаменка: «Найбліжэйшыя дзесяцігодзьдзі будуць часам аднаўленьня спадчыны»

Зь лідэрам гурту «Палац» гутарыць Наталка Бабіна.



Андрэй Лянкевіч

**«Наша Ніва»: Раскажыце, калі ласка, пра сябе: адкуль Вы, хто Вашыя бацькі, як адбывалася Вашае сталеньне, адкуль займелі цікавасьць да аўтэнтыкі?**

**Алег Хаменка:** Нарадзіўся я ў Менску. Дзяцінства і юнацтва маё зьвязаныя зь менскім мікраёнам Чыжоўка. Пазьней былі іншыя «прэстыжныя» мікраёны: Дражня, Малінаўка. Мой бацька з Палесься — вёска Браніслаў Жыткавіцкага раёну Гомельшчыны. Маці з заходняй Меншчыны, зь вёскі Шашкі, што між Івянцом і Стоўпцамі. Сярод маіх родных амаль усе былі здатныя да музыкі і слова, магчыма, адсюль мае захапленьні даўнейшай песьняй.

**«НН»: Дзе Вы цяпер жывяцё, чым цікавіцеся, акрамя працы? Як бавіце вольны час? Раскажэце пра жонку, дзяцей, найлепшых сяброў.**

**АХ:** Жыву я ў Менску, мікраён Малінаўка. Думаю, што перабрацца ў цэнтар не хапае ня толькі грошай, але і жаданьня. Жанаты я амаль дваццаць год. Мая жонка Жанна зь Віцебшчыны. Сын вучыцца і працуе тэлевядоўцам праграмы «К-ігры» на 8-м канале. Сяброў у мяне багата. Кажуць, што «сапраўдных сяброў» адзінкі. У мяне ня так. Але дзясятак прозьвішчаў проста пералічыць — які сэнс? А распавесьці пра кожнага... наступным разам. Акрамя музыкі і аўтарскіх радыёпраграм, я выкладаю мэнэджмэнт у сацыякультурнай сфэры ў Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце культуры і мастацтваў, захапляюся культуралёгіяй, этналёгіяй і працую над дысэртацыйным дасьледаваньнем, зьяўляюся сябрам музычнага парталу «Тузін гітоў»... Карацей — усяго не пералічыць. Вольны час — як і ўсе: сябры, родныя, падарожжа, прырода.

**«НН»: Як Вы прыйшлі да сёньняшняй адметнай творчай манеры? Ці — у гэтым сэнсе — Вы мелі настаўнікаў?**

**АХ:** Напэўна, Вы кажаце пра манеру сьпяваць? Ёсьць такое разумнае слова — «самадыдакт». Гэта прыкладна так, як Армстронг вучыўся на трубе граць джаз — ад пачуцьцяў, ад таго, як сьпявалі суайчыньнікі, ад унутранага самааналізу. Ды і раней у вёсках ніхто нікога не вучыў. Сьпявалі як чулі, манеру пераймалі на слых. Мне здаецца, што, калі я ўжо валодаў гэтай манерай сьпяваць, нейкім штуршком, каб паспрабаваць рабіць гэта на сцэне, зьявілася знаёмства з творчасьцю ансамблю Пакроўскага і самадзейным ансамблем пад кіраўніцтвам Івана Кірчука.

**«НН»: Я не спэцыяліст, але слухаць тое, што цяпер гучыць пад назвай «песьні» па радыё і тэлевізары, вельмі часта не магу. Чаму, на Вашу думку, так многа «ніякай» музыкі?**

**АХ:** Цяпер у сьвеце ўся музыка імкнецца да функцыянальнасьці: танцавальная, для шоўпастановак, для кінастужак, фонавая, на кожны дзень, для сьвята і г.д. Гэта зьвязана з тым, што музычны бізнэс патрабуе штодзённага аднаўленьня. А стварыць дзясятак моцных сьпеўных твораў можа толькі геніяльны творца. Звычайна гэта адна—дзьве песьні за жыцьцё. А як зарабіць далей? За што жыць? Таму патрэбна канвэернае стварэньне музыкі. Шчырай песьні, безумоўна, не хапае, і галоўным чынам таму, што народныя, спрадвечныя песьні мы забыліся, а савецкія сьпеўныя гіты згубілі актуальнасьць у новай сыстэме каштоўнасьцяў. Такое дрэннае для беларускай песьні становішча, мне здаецца, у найбліжэйшыя дзесяцігодзьдзі захаваецца. Гэта будзе час аднаўленьня спадчыны і адсеву лухты дзеля назапашваньня новай культурна-музычнай скарбніцы.

### Чыноўнікі не гатовыя ўявіць эўра-гіт па-беларуску

**«НН»: «Кола грукатала» — геніяльная песьня, на маю думку, у якой тэкст, музыка, выкананьне бездакорныя і ўзмацняюць адно другое. Як яна стваралася?**

**АХ:** Нагадаю, што слова «геніяльны» ўжываецца толькі па нейкім часе пасьля сьмерці аўтара. Адзінае, што мушу сказаць, — гэта твор, над якім мы працавалі недазвольна доўгі час — амаль тры гады.

**«НН»: «Кола грукатала» ня трапіла на Эўрабачаньне. Як Вы думаеце, чаму? Ці засмуціла Вас гэта?**

**АХ:** Цудам было тое, што мы падалі заяўку і нас адабралі ў паўфінал. Цудам было тое, што тэлефоннае галасаваньне (пры безумоўнай спрэчнасьці вынікаў) паказала, што грамадзтва куды больш прасунутае, чым шаноўнае журы. Але каб яшчэ і гурт, якога не паказвалі на дзяржаўных каналах тры гады, зь беларускамоўнай песьняй паехаў прадстаўляць сваю краіну і БДТРК на Эўрабачаньне... Ну, такога цуду нават чакаць было нерэальна.

Якая карысьць Беларусі і нашаму тэлебачаньню ад удзелу ў Эўрабачаньні Агурбаш, Калдуна?..

На жаль, журы і чыноўнікі пакуль яшчэ не гатовыя адпрацаваць усе неабходныя атрыбутыўныя рэчы, каб на Эўрабачаньне паехалі нашыя выканаўцы, а не праекты расейскіх прадусараў ці жонкі расейскіх прадпрымальнікаў. Не гатовыя ўявіць сабе эўра-гіт на беларускай мове. Аднак якасны крок дзеля таго, каб журы і Белтэлерадыёкампанія задумаліся, — мы зрабілі. Бо якая карысьць Беларусі і нашаму тэлебачаньню ад удзелу ў гэтым фэсьце Агурбаш, Калдуна?.. Гэтыя асобы і іх талент ужо ёсьць здабыткам шоў-бізнэсу іншай краіны ды і іншай культуры. А трэба прасоўваць прадстаўнікоў сваёй. Няхай апошняе месца, але на роднай мове. Няхай кепскі кліп, але каб нашыя вобразы, сымбалі, рэжысэры, апэратары, сучасныя беларускія мастакі і фэшндызайнеры. Трэцім, чацьвертым разам навучыліся б рабіць большменш якасны ўласны прадукт... і цяпер Беларусь была б пазнавальнай і чаканай на экране. Гэта была б разумная стратэгія.

**«НН»: Як бы Вы акрэсьлілі ўзровень гэтага конкурсу? Чаго там больш: мастацтва ці бізнэсу?**

**АХ:** Мастацтва цяпер падзяляецца на клясычнае — якое неабходна падтрымліваць, бо гэта падмурак; папулярнае — якое здольнае існаваць як бізнэс; і стратэгічнае — якое стварае спрыяльныя сацыякультурныя ўмовы для прасоўваньня эканамічных бізнэс-інтарэсаў. Таму ўзровень Эўрабачаньня даволі сур'ёзны, аднак мастацтва папулярнае і стратэгічнае там займае галоўныя пазыцыі.

### Няўтульна, але ўпэўнена

**«НН»: Ці многа Вы цяпер выступаеце? Дзе Вас можна пачуць?**

**АХ:** Даволі шмат замоўленых прыватных выступаў і канцэртаў. Білетныя канцэрты граем даволі рэдка. У найбліжэйшым часе — у Віцебску 26 траўня, у Беластоку — 2 чэрвеня.

**«НН»: Ці адчуваеце задавальненьне ад працы, ці няма ў Вас пэўнай стомленасьці? Ці Вы жывяце на тое, што зарабляеце як музыка?**

**АХ:** Працы вельмі шмат. І запісы, і рэпэтыцыі. Але ўсе хлопцы забыліся пра колькасьць і ўпёрліся ў якасьць. Я пакуль падзяляю гэты погляд. Наконт заробкаў: за ўсё жыцьцё ня бачыў творчых людзей, якім бы хапала грошай...

**26 траўня ў віцебскім летнім амфітэатры** разам выступяць каралі беларускай этнамузыкі – **«Палац»**, **«Тройца»** і **Osimira**. Канцэрт называецца «World Music Tree» («Сусьветнае музычнае дрэва»). Квіткі — 8—20 тыс. рублёў.

**«НН»: Ці Вы ўтульна пачуваецеся ў сьвеце беларускага шоў-бізнэсу, ці ўсё ж стаіцё па-за ягонымі рамкамі?**

**АХ:** Ня тое каб утульна, але даволі ўпэўнена.

**«НН»: Як Вы ставіцеся да сваёй творчасьці: гэта нешта больш штодзённае, актуальнае, ці больш імкненьне да вечнага?**

**АХ:** Калі чалавек штосьці стварае, ён імкнецца наблізіцца да Божага вобразу, бо мы створаныя паводле Ягонага падабенства. Творчасьць — гэта жыцьцёвая неабходнасьць.

**«НН»: Вы, пэўне, многа езьдзілі па сьвеце. Якой Вам падаецца Беларусь і беларусы ў параўнаньні зь іншымі краінамі? Ці ёсьць у нас адметнасьці, ці глябалізацыя зраўняла ўжо й іх?**

**АХ:** Моцна гняце падсьвядомы боль, што нам няма чым ганарыцца і ўсё «ў нас» расстраляна і зруйнавана, а «ў іх» выжыла і захавалася. Нам відавочна нестае самасьвядомасьці і самапавагі, сказаў бы нават — гонару. А гонар набываецца дзесяцігодзьдзямі праз адказнасьць за ўласныя справы і павагу да спадчыны.

## Анатоль Длускі



Я вас люблю, мои друзья, Ковчег, 2008

Толькі ці захоча гэта нехта спажываць?

Альбом ці то барда, ці то шансанье сьведчыць толькі пра адно: яму вельмі хочацца сьпяваць.

Пра музычны чыньнік хіба ня будзем — пануры тэмп, па-карчмарску разьдзяўбаныя клявішы ды блатныя акорды. У такім кірунку эмоцыямі трэба браць. А Длускі, хоць і напружвае зьвязкі часам, не дае рады. Голас яго часам удае на Высоцкага, але ўсё болей на прафэсара Лебядзінскага :).

Сваё немудрагелістае творчае крэда сьпявак выказаў, пэўна, у песеньцы пра «Жыцьцё»: ах, маўляў, як хочацца проста жыць ды проста сьпяваць. Але ж пытаньне ў тым, ці захочацца гэта каму-небудзь спажываць. Аўруцін беларускай аўтарскай песьні, акром вечных тэмаў пра жыцьцё ды любоў, уздымае і надзённае: трэба, бач ты, братцы, вяртаць наш СССР. Туга без прасьвету па вялікай краіне чуецца па ўсім альбоме: «В одночасье разрушили тебя, Страна», — пакутуе аўтар. «Наш дом 15 этажей, жил белорус, туркмен, еврей…» — тут ужо настальгічная сьляза пацякла. «Беларусь, Украина, Россия — это вера, надежда, любовь», — а тут ужо зусім без камэнтароў. Цікава, калі б зладзіць публічны двубой Длускі-Бартосік — хто б выйграў? :) У незаідэалягізаваных песьнях выканаўца апынаецца банальным, часта да моташнасьці: «Ах, гимнасточка, порхаеш ты, как ласточка». Карчмой патыхае. Вельмі таннай карчмой.

## Беларускі музычны авангард



НМК, 2008

Услухацца ды пачуць увесь калярыт таго ці іншага інструмэнту ды паспрабаваць злавіць кампазытарскую фантазію.

Складанка твораў адных з самых яскравых прадстаўнікоў айчыннай сымфанічнай і камэрнай музыкі. Афіцыйна выдадзены дыск такой музыкі — рэдкасьць надзвычайная. У гэтай плыні сытуацыя такая, як зь беларускім незалежным рокам канца 1980-х: запісы недзе ёсьць, але ў музычных крамах іх ніхто ня бачыў. У складанку ўвайшлі творы тых, хто стаяў ля вытокаў ці ўваходзіць у Беларускае таварыства сучаснай музыкі. Гучаць тут і гітара з саксафонам (творы Зьмітра Лыбіна і Яўгена Паплаўскага), і арфа з арганам (Мікола Стома, Ганна Кароткіна). Творы — розных часоў: славутыя «Повязі для флейтаў» Стомы, датаваныя 1989 годам, а сюіта для аргану «Францыск» Кароткінай — з 2004 году. Услухацца ды пачуць увесь калярыт таго ці іншага інструмэнту ды паспрабаваць злавіць кампазытарскую фантазію — вось дзеля чаго варта слухаць гэты дыск. Ён пасуе пад своеасаблівы настрой — калі хочацца пабыць на самоце, абстрагавацца ад вонкавага сьвету, але не прыгнятацца цішынёю. Нельга не адзначыць цудоўнага аздабленьня дыску аўтарства Андрэя Бурсава.

## Князь Мышкін

Выйшла зусім ня сумна.



На куцьцю, самвыдат, 2008

Гурт з самай багатай за ўсіх беларускіх музыкаў дыскаграфіяй гэтым разам скіраваў увагу на клясыку і запісаў альбом імправізацый на тэму паэмы Янкі Купалы «На куцьцю». Выглядае гэта наступным чынам: дэкляматар (Зьміцер Падбярэскі) выразна і без эмоцыяў, як тую дыктоўку, чытае клясыку, а музыкі (Леанід Нарушэвіч на гітары і Віктар Сямашка на духавых) у міжчасьсі паказваюць, як яны няслаба авалодалі тэхнікай ігры на сваіх інструмэнтах. Але выйшла зусім ня сумна, як можа падацца на першы погляд. Толькі музыкам вядомы сакрэт, як іх інтуіцыйная імправізацыя сталася гарманічным працягам і фактычна зьлілася з тэкстам паэмы, напісанай на 98 год раней. Вядома ж, праца «Мышкіна» не ідзе ў параўнаньне зь песьняроўскім «Гусьляром». Ды гэта і рок-опэрай не назавеш, хутчэй, такая літаратурна-музычная кампазыцыя — жанр занядбаны, але куды багацейшага і цікавейшага фармату, чым папулярная сёньня аўдыёкніга. Праца пакуль так і не знайшла выдаўца, але слухача знойдзе дык дакладна.

**Сяргей Будкін**




ІГАР МАЦЮНОЎ

# Дзесяць колераў «Сон-травы»

Пра «Тройцу» пісаць складана, іх трэба слухаць. Пажадана жыўцом, а ня ў якасьці фону. Трэба застацца з гэтай музыкай сам-насам, каб адчуць яе.

На выходных у Менску адбылася доўгачаканая падзея: этна-трыё прэзэнтавала новы, запісаны ў Польшчы, альбом «Сон-трава».

Распачаўся канцэрт-прэзэнтацыя з «Чамбору» — першай на новай плыце песьні. У перапынках паміж кампазыцыямі лідэр гурту Іван Кірчук знаёміў слухачоў з новымі песьнямі, апавядаючы гісторыі іх зьяўленьня ў рэпэртуары. Адна зь іх, сірочая, была запісаная ў экспэдыцыі ў жанчыны, якая, са словаў Кірчука, «сьпявала нам ад ранку да гадзіны ночы, а потым сказала, што гэта не яе, а матчыны песьні». «Ці многія з нас могуць прыгадаць хоць адну песьню, што сьпявала нам маці?» — запытаўся музыка.

У той вечар музыкі не абмежаваліся толькі новымі творамі. Іван Кірчук не бяз гонару паведаміў, што кліп на песьню «Тры янгалы» на сайце гурту паглядзелі 12 000 чалавек. Гэтая песьня, запісаная ў Чарнобыльскай зоне, у вёсцы Барталамееўка Веткаўскага раёну. Слухаючы «Ой, у нашым у Раю жыць весела, жыць весела, толькі некаму», разумееш, чаму песьня застаецца папулярнай.

З музыкай «Тройцы» трэба застацца сам-насам, каб адчуць яе.

Калі Джыму Джармушу засьвярбіць зьняць нешта кшталту «Мерцьвяка», то Нэйлу Янгу варта будзе непакоіцца пра канкурэнцыю. Музыка «Тройцы» сапраўды ашаламляльная. Дый сам канцэрт быў проста фантастычна зрэжысэраваны. Было прадумана ўсё, нават асьвятленьне. Кожная песьня суправаджалася сваім спалучэньнем колераў: «Чамбор» сьвяваўся ў насычаных зялёных, з дамешкам чырвонага, тонах, «Вуціца» — сіне-блакітных, салдацкая «Наляцелі» — натуральна, у крывавых, з густым дамешкам дыму.

Публіка двойчы клікала «Тройцу» на біс. На разьвітаньне Кірчук засьпяваў «Журавы» і «Яблынь мая» («такі сабе беларускі гімн, бо вясёлы і пра вясну»). Наступная сустрэча адбудзецца ў Віцебску 26 траўня.

**Сямён Печанко**

# Гісторыя забойства і нявіннасьці

У Сімфэропальскім СІЗА ад 25 чэрвеня 2007 году ўтрымліваецца беларус Ігар Коктыш. Ён чакае экстрадыцыі ў Беларусь, дзе мае адбыцца суд за наўмыснае забойства.

Ігар Коктыш быў вядомы ў Баранавічах як каталіцкі актывіст. Ягоная суполка змагалася супраць нарказалежнасьці і моладзевых самагубстваў. Ён іграў таксама ў гурце «Млечны Шлях».

У студзені 2001 году Коктыш трапіў пад крымінальную справу, яго абвінавацілі ў забойстве сваяка блізкага сябра. У чаканьні суду лідэр «Млечнага Шляху» дзесяць месяцаў правёў у баранавіцкім СІЗА.

Там, як ён сьцьвярджае, яго катавалі, пакідаючы голага ў халоднай камэры, не даючы лекаў супраць астмы, зьбівалі. 7 сьнежня 2001 году Берасьцейскі раённы суд прызнаў яго невінаватым. На судзе дзесяць чалавек засьведчылі, што на момант забойства, у якім вінавацілі Коктыша, ён знаходзіўся ў іншым горадзе. 1 лютага 2002 году Вярхоўны суд пакінуў гэтае рашэньне ў сіле.

Аднак у красавіку таго ж году генпракурор апратэставаў гэты вэрдыкт, і справу вярнулі на перагляд у той жа Берасьцейскі раённы суд.

І.Коктыш на той момант зьехаў ва Ўкраіну лячыць астму. Там ён ажаніўся і разам з жонкай стварыў новы музычны гурт, які мае посьпех на ўкраінскай сцэне. У Беларусь вырашыў не вяртацца, поўны жаху пасьля месяцаў, праведзеных у Баранавіцкім СІЗА.

25 чэрвеня 2007 году супрацоўнікі ўкраінскай міліцыі арыштавалі Коктыша. Ён да сёньня чакае экстрадыцыі ў Беларусь. 11 траўня музыка адзначыў за кратамі 28-ы дзень народзінаў.

Справа мае міжнародны розгалас. У кастрычніку мінулага году Эўрапейскі суд па правах чалавека забараніў Украіне перадаваць арыштаванага беларускаму боку, а «Міжнародная амністыя» адначасова правяла акцыю тэрміновай дапамогі, зьвярнуўшыся да ўкраінскіх уладаў з патрабаваньнем не дазволіць экстрадыцыю. Украінская хрысьціянская інтэрнэт-супольнасьць стварыла адмысловы сайт у падтрымку Ігара Коктыша.

**Сямён Печанко**

# Яраслава Мудрага прызналі найвялікшым украінцам

На тэлеканале «Інтэр» скончыўся праект «Вялікія Ўкраінцы». Ягоным пераможцам нечакана стаў князь Яраслаў Мудры. Наступныя месцы занялі кардыёхірург Амосаў і нацыяналіст Бандэра.

У ноч зь пятніцы на суботу на тэлеканале «Інтэр» скончылася фінальная перадача праекту «Вялікія Ўкраінцы». У студыі разгарнулася гарачая дыскусія паміж «адвакатамі» кожнага з кандыдатаў на званьне Вялікага Ўкраінца №1.

У выніку за Яраслава Мудрага прагаласавала звыш 648 тысяч украінцаў, гэта 40% галасоў. Другое месца заняў хірург Мікалай Амосаў, асобу якога падтрымалі 322 тысячы грамадзян Украіны. На трэцім месцы — лідэр Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў Сьцяпан Бандэра, які атрымаў падтрымку 261 тысячы ўкраінцаў.

Чацьвертае месца займеў паэт Тарас Шаўчэнка (150 тысяч галасоў), на пятым апынуўся гетман Багдан Хмяльніцкі (64 тысячы галасоў), шостае месца заняў футбаліст і трэнэр Валер Лабаноўскі (яго падтрымала 51 тысяча ўкраінцаў), сёмае месца ў палітычнага дзеяча Вячаслава Чарнавіла, якога падтрымалі 42 тысячы гледачоў тэлеканалу «Інтэр».

Замыкаюць дзясятку Вялікіх Украінцаў філёзаф Рыгор Скаварада, паэтка Леся Ўкраінка і пісьменьнік Іван Франко.

На працягу ўсёй праграмы ўдзел у галасаваньні ўзялі каля 2,5 мільёнаў жыхароў Украіны, што, паводле словаў вядоўцы Савіка Шустэра, зьяўляецца эўрапейскім рэкордам.

Хоць вынікі тэлеапытаньняў нараджаюцца такім жа чынам, як і элегантныя перамогі дыктатараў, тым ня менш ён паказальны для стану розуму сучаснай Украіны.

**НБ**

## СЬЦІСЛА

### Па праспэкце пусьцяць бясплатны аўтобус

КУП «Менсктранс» у сувязі з закрыцьцём станцыі Менскага мэтрапалітэну «Кастрычніцкая» на рэканструкцыю арганізуе наземны варыянт перамяшчэньня ад плошчы Незалежнасьці да плошчы Перамогі. Праезд для пасажыраў будзе бясплатным. Станцыя «Кастрычніцкая» будзе зачыненая для пасадкі й высадкі пасажыраў. Зачыняць і перасядку між «Купалаўскай» і «Кастрычніцкай».

### Ярмошына адпачывае ў Эгіпце

Старшыня Цэнтравыбаркаму ўзяла кароткачасовы адпачынак і цяпер знаходзіцца ў Эгіпце. Як вядома, ёй забаронены ўезд у краіны Эўразьвязу і таму Ярмошына вымушана праводзіць адпачынак у іншых рэгіёнах. Два гады таму Ярмошына абуралася — маўляў, другі год еджу ў Турэччыну, паколькі Эўропа для мяне зачынена. «І я ад гэтага шалею, паміж іншым,» — шчыра прызналася яна тады журналістам.

### Крывавая аварыя на Магілёўскай шашы

На ажыўленым участку трасы Менск—Магілёў сутыкнуліся адразу некалькі аўтамабіляў. Адзін чалавек загінуў, пяцёра трапілі ў бальніцы. Сутыкненьне здарылася раніцай у нядзелю на 18 кілямэтры. Аўтамабіль BMW на вялікай хуткасьці літаральна пратараніў таксоўку, якая ішла паперадзе. У выніку таксоўку сьпярша кінула на мэталічную агароджу, пасьля занесла на іншую паласу. Удар быў нагэтулькі моцным, што рухавік вылецеў з машыны. Пры гэтым сутыкнуліся яшчэ два аўто й рэйсавы аўтобус. Пяць чалавек, у тым ліку два дзіцяці, з рознымі траўмамі дастаўленыя ў бальніцу.

Паводле інспэктараў ДАІ, кіроўца BMW быў нецьвярозы, яго неаднаразова штрафавалі за парушэньне хуткаснага рэжыму й за кіраваньне ў нецьвярозым выглядзе.

### Беларускія палярнікі прыбралі за расейцамі

Падрыхтоўка палявой базы «Гара Вячэрняя» да прыёму наступных дасьледчыкаў была галоўнай мэтай першай беларускай антарктычнай экспэдыцыі, якая цягнулася 102 дні — са студзеня па красавік. Як паведаміў кіраўнік экспэдыцыі Аляксей Гайдашоў, база «Гара Вячэрняя» належыць Расеі, але з 1993 году яна не эксплюатуецца. Беларускія палярнікі ня толькі прыбралі сьмецьце — 12 тонаў, але і пераплянавалі частку памяшканьняў, а таксама зрабілі іх касмэтычны рамонт. Да ўсіх аб'ектаў падключылі сьвятло і ваду. Цяпер база можа прыняць наступную экспэдыцыю, якая ўжо будзе займацца навуковай працай.

**СП; БЕЛТА, ont.by, радыё «Рацыя», радыё «Свабода»**

# Заваяваньне Квэбэку

Расея стала чэмпіёнам сьвету па хакеі першы раз за 15 гадоў.

Ужо 22 гады зборная, якая прымае чэмпіянат сьвету па хакеі, ня можа выйграць першынства. У нядзелю канадцы ў Квэбэку ў фантастычнай фінальнай гульні ўмудрыліся прайграць расейцам. Наша ўсходняя суседка пасьля пятнаццацігадовага перапынку ўпершыню ўзьнялася на верхні радок.

Канадцы мелі неаспрэчную гульнявую перавагу, але ў апошняй дваццаціхвілінцы ўсё раптоўна зьмянілася. Спачатку працоўную шайбу закінуў Цярэшчанка, а пасьля надышоў час Ільлі Кавальчука. За ўвесь турнір зорка НХЛ Кавальчук не закінуў ніводнай шайбы, але ў фінале выраўняў лік за пяць хвілін да сканчэньня асноўнага часу, а ў овэртайме прынёс расейцам перамогу. Першую за 15 гадоў.

Бронзу на сёлетнім чэмпіянаце заваявалі фіны, які ў матчы за трэцяе месца перамаглі Швэцыю — 4:0.

Наступны чэмпіянат сьвету праз год прыме Швайцарыя. Будуць там гуляць і беларусы. Разам з намі ў групе будуць змагацца Канада, Славаччына і Вугоршчына.

Што праўда, пакуль не вядома пад чыім кіраўніцтвам мы пачнем гэты турнір. Пасьля гэтага першынства ўсё гучней чуваць галасы тых, хто патрабуе адстаўкі Курта Фрэйзэра. Апошняе слова будзе за міністрам унутраных справаў і кіраўніком фэдэрацыі хакею Ўладзімерам Навумавым.

**Зьміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Аляксандар Суліма, былы брамнік зборнай Беларусі, цалуе заваяваны трафэй. У фінале Кубку Беларусі ягоная МТЗ-РІПА перайграла салігорскі «Шахтар». Пераможцы трапяць на Кубак УЭФА.**

# Дзень швэдзкага сьцяга — у Беларусі сёмы раз

**З 21 траўня па 5 ліпеня.**

Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску пры падтрымцы Швэдзкага Інстытуту, сумесна зь беларускімі партнэрамі (фотагалерэя «Мир фото», кінатэатар «Цэнтральны», Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва, канцэртнае агенцтва «Лінія гуку») праводзяць традыцыйныя Дні культуры Швэцыі, прысьвечаныя Нацыянальнаму Дню Швэцыі (Дню швэдзкага сьцяга), якія адбудуцца ў Беларусі ў сёмы раз.

Інфармацыйнымі спонсарамі Дзён культуры Швэцыі зьяўляюцца:

Беларускі партал Tut.by, «Комсомольская правда в Белоруссии», канал «Культура» беларускага радыё, гарадзкі часопіс Where Minsk, музычнае тэлебачаньне MTV, інтэрнэт-парталы Zнята і Mixtura.org.




## ВЫСТАВЫ

**Выстава сцэнаграфіі**

**У музэі гісторыі беларускага кіно (Сьвярдлова, 4) да 24 траўня** працуе выстава сцэнаграфіі.

Экспазыцыю складаюць макеты, эскізы, накіды і фатаздымкі дзесяці мастакоў да спэктакляў.

**Слуцкія паясы**

Да канца году **ў Нацыянальным мастацкім музэі (вул. Леніна, 20.)** будуць экспанавацца слуцкія паясы з калекцыі Дзяржаўнага гістарычнага музэя (Масква). **Працуе выстава ад 11-й па 19-ю штодзень акрамя аўторка.**

## КАНЦЭРТЫ

**World Music Tree**

**26 траўня. 20.00. Віцебск. Летні амфітэатар.** Частка першая. Беларусь. Сумесны канцэрт трох найлепшых калектываў беларускай этна-музыкі: **«Палац», «Тройца», OSIMIRA**. Квіткі: 8000 — 20 000

**Apple Tea**

**27 траўня. 20.00. Клюб «Графіці» (зав. Калініна, 16).** Легендарны джаз-рок гурт Apple Tea. Тэлефоны: (029) 671-58-65, (029) 254-49-09

**Vicious Crusade**

**30 траўня. 18.00. Клюб «Рэактар» (вул. В. Харужай, 29).** Пры падтрымцы Sacramental Wine. Спэцыяльныя госьці: вакалісты Znich, Imprudence і God Mode. Кошт квіткоў: 15 000 (першыя сто), 18 000 (астатнія да дня канцэрту), 20 000 руб. (у дзень канцэрту ў касах клюбу), 25 000 (за столікам). Даведкі: 288-61-60, 766-24-25, 649-08-88

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**25 (ндз), 26 (пн)** — «Пінская шляхта»
**28 (ср)** — «Чычыкаў»
**29 (чц)** — «Я не пакіну цябе»
**30 (пт)** — «Памінальная малітва»
**31 (сб)** — «Ідылія»
**1 (ндз)** — «Слуга двух гаспадароў»
*малая сцэна*
**29 (чц)** — «Апэльсінавае віно»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**23 (пт)** — «Містэр Розыгрыш»
**26 (пн)** — «Неба ў дыямэнтах»
**27 (аўт)** — «Эмігранты»
**29 (чц)** — «Ігвіта, або Як гэта рабілі ў Францыі»
**30 (пт)** — «Адвечная песьня»
**31 (сб)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Хронікі Нарніі: Прынц Касьпіян»

**Хронікі Нарніі: Прынц Касьпіян** (The Chronicles of Narnia: Prince Caspian)

ЗША — Вялікабрытанія, 2008, каляровы, 108 хв.

**Рэжысэр:** Эндру Адамсан

**Ролі выконваюць:** Бэн Барнз, Джордж Генлі, Скандар Кайнз, Ўільям Мозьлі, Сэрджыё Кастэліта, Пітэр Дзінклэйдж, Ўорўік Дэйвіс

**Жанр:** Фэнтэзі паводле кнігі Клайва Сынклера Льюіса

**Адзнака:** 5,5 (з 10)

Героі нарнійскіх хронік дзеці Пэвэнсі вяртаюцца ў чароўную краіну. Але, калі ў Англіі прайшоў год, то ў Нарніі мінулі стагодзьдзі. Краіна разбураная, гномы й кентаўры схаваліся ў лясах, а па суседзтве пануе падступны кароль Міраз. У Нарніі ёсьць надзея — юны прынц Касьпіян. Ангельскія падлеткі — «старажытныя каралі і каралевы», далучаюцца да Касьпіяна і ўзначальваюць нарнійскую армію…

Другая частка нарнійскіх хронік патанае ў попельна-шэрых колерах зла. Агромністы палац Міраза, цёмныя сутарэньні, начныя сцэны, зьляканы й сьцішаны лес. Хаця кампутарных эфэктаў, у параўнаньні з папярэдняю часткай, няшмат, дэкарацыі й касьцюмы ўражваюць: для арміі тальмарынцаў было выкавана амаль 4 тысячы кальчугаў і масак. Героі-падлеткі зацята ваююць (і забіваюць!), крычыць у пакутах парадзіха, усьміхаецца злы кароль.

Хрысьціянскія алюзіі, якія захоўваліся ў ранейшых хроніках, з гэтага фільму зьніклі; стужка пераўтварылася ў халаднавата-нязграбнае фэнтэзі пра гераічныя бітвы.

Хаця фінальная бойка — маштабнавідовішчная, сьветлыя чары дабра выдыхліся; ангельскія дзеці — ваяўнічабадзёрыя макеты, а мудры леў — кампутарны статыст.

На гэткім тле зухаваты баявы мыш — як бальзам на глядацкае сэрца.

Актор Бэн Барнз у ролі прынца Касьпіяна бярэ больш фактурай, падкалодна-падступны Сэрджыё Кастэліта (кароль Міраз) яго перайграе.

«Прынц Касьпіян» ня лезе ў шэдэўры, але й не катуе нудой. Заўзятары «Хронік Нарніі» знойдуць у ім дарагія ўзгадкі, але й незадаволеных будзе шмат.

**Андрэй Расінскі**

**Увага!**

**З 22 траўня ў Менску** адбудзецца доўгачаканая **прэм'ера «Індыяны Джонза і Каралеўства Крышталёвага Чэрапу»**. Чытайце рэцэнзію ў наступным нумары і ў інтэрнэце.




## КАЛІ Б...

**...улады пачалі продаж дзяржаўных прадпрыемстваў — фамільнага срэбра беларусаў.**



**Ён Беларусу:** «Каб стаць сапраўдным азіяцкім тыграм, ты мусіш адмовіцца ад эўрапейскіх забабонаў: есьці вілкай, нажом і лыжкай».

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## Не карміце птушак хлебам

Каралеўскае таварыства аховы птушак Вялікабрытаніі, якое налічвае каля мільёна сяброў, рэкамэндавала не карміць дзікіх птушак хлебам. У хлебе няма карысных рэчываў для птушыных, але яны набіваюць ім страўнік, замест таго, каб шукаць больш здаровую ежу. Таксама ня варта даваць птушкам малако, арахіс і прадукты, што ўтрымліваюць ненасычаныя тлушчы.

Таварыства рэкамэндуе даваць птушкам пакрышаны сыр, аўсянку, мяккія яблыкі, бананы, суніцы, кавалкі адваранай у мундзірах бульбы, рыс і шматкі для сьнеданьня.

У Каралеўскім таварыстве кажуць, што асабліва ўвесну, калі птушкі выводзяць птушанятаў, для іх вельмі важна паўнавартае харчаваньне. Але падкормліваць іх трэба вельмі разборліва.

Брытанія вядомая сваім трапяткім стаўленьнем да дзікай прыроды, нагадвае Бі-Бі-Сі, падаючы гэтую інфармацыю.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

### СУСТРЭЧЫ

**Паважаныя выпускнікі** фізычнага факультэту БДУ, гады навучаньня 1953–1958! Запрашаем вас на сустрэчу выпускнікоў! Сустрэча плянуецца на 5 чэрвеня 2008 г. Збор а 15–й на двары БДУ. Т.: (029) 171–80–05 (Галубовіч Валя), (029) 772–94–94 (Кірдун Ева). kirduneva@tut.by

### ЛЕЦІШЧА

**Прадам за 34 тыс**. лецішча (драўляны дом 105 кв. м., абкладзены цэглай (недабуд на 35%), з надзелам 6 сотак (1 км. ад МКАД)). Ёсьць крама, электрычнасьць, вада, хуткая пэрспэктыва газу ды ўваходжаньня ў склад Менску (з правам прапіскі); ходзяць менскія аўтобусы ды маршруткі. Т.: (029) 576–74–29

### КВАТЭРА

**Прадаецца** аднапакаёвая кватэра па вул. Усходняя ў Менску, 4 паверх уцепленага дому. Мэталічныя дзьверы, шклопакеты, вокны ў парк, гаўбец зашклёны, сутарэньні, добры стан. Т.: (029) 754–62–34, (029) 335–62–42

### ВЯСЕЛЬЛЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Тэл.:** 7846313 (МТС); 9117887 (Velcom). Наста

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Запрашаем у падарожжа** «Браслаўскі край» 25 траўня (нядзеля) па маршруце: Менск — Удзела — Мосар — Слабодка — Друя — Браслаў — Браслаўскія азёры — Менск. Т.: (017) 292–54–58, (029) 622–57–20, 509–12–16, 110–19–28.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Навагрудак.** Наш павятовы горад Навагрудак пасьля пажару, што быў летась у восень, калі згарэла блізка палавіна гораду, пачаў патроху адбудоўвацца і аджываць. Дамы будуюць харошыя і вялікія, крыюць бляхай або дахоўкай, а некаторыя ставяць мураваныя.

У марцы месяцы памешчыкі адкрылі склад гаспадарскіх машын, рознага збожжа і насеньня. Усё тут прадаецца таньней і лепшае, як у крамах. Напрыклад, сярпоў прадалі 500 штук па 35 кап.; але народ як кінуўся іх грамадой купляць, дык у суматосе некаторыя бралі і дарма, так што склад меў страту.

**«Наша Ніва». №19. 1908**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», падпішыцеся.

**Дзякуй!**

**В.Г., Н.К., А.А.** зь Менскага раёну.
**Міхаілу М.** са Стаўпецкага раёну.
**Вользе Ж.** з Барысаўскага раёну.
**Міхаілу Ю.** з Клімавіцкага раёну.
**Антаніне К.** з Крупскага раёну.
**Лявонцію А.** з Полацкага раёну.
**Таццяне Б.** з Магілёва.
**Уладзімеру В., Генадзю К.** з Горадні.
**Уладзімеру Т., Аляксандру П.** з Жлобінскага раёну.
**Любові Ш., Уладзіславу І., Пятру С., Ганьне П., Канстанціну С.** зь Віцебску.
**Валянціну М., В.А.** зь Сьветлагорскага раёну.
**Вользе А.** зь Любанскага раёну.
**Вользе П.** з Бабруйскага раёну.
**Мікалаю В.** зь Бярозаўскага раёну.
**Зьмітру Т., Л.Г.** з Мастоўскага раёну.
**Ірыне З., Антону Т., М.Я.** з Смалявіцкага раёну.
**Мікалаю С.** з Ганцавіцкага раёну.
**Сьвятлане Ц.** з Маладэчанскага раёну.
**Руслану Р., Вячаславу С., Валеру П.** з Баранавіцкага раёну.
**Міхаілу Т.** са Слуцкага раёну.
**Віталю С., Генадзю Л., Багдану Дз.** з Гомелю.
**А.Г.** з Магілёўскага раёну.
**Уладзімеру З., Аксане Д.** зь Пінскага раёну.
**В.К.** з Полацку.
**Сяргею К.** з Салігорскага раёну.
**Р.П.** з Пружанскага раёну.
**Веры М.** з Навагрудзкага раёну.
**Яўгену Л., Н.К., К., Надзеі П., Аляксандру Н., Багуславу У., В.Ш., Веры С., Аляксею Ф., А.С., Аляксандру С., П.Дз., В.Р., Юр’ю М., Аляксею К., Алене М., Яўгену Ш., В.В., Сяргею М., Міхаілу Ж., С.Т., А.Б., Алене М., Лідзе П., Альберту С., Георгію Л., І.З., П.Д., Ларысе М., Т.П., С.К., Аляксандру Ф., Эдуарду К., Аляксею Ш., Яўгену К., Алене М., Лізе П., А.Г., Ігару Г., Ігару Б., В.Г., Д.К., Рыце Н., М.Б., Кірылу М., І.І., Уладзімеру Р., Уладзімеру Г., Юр’ю Л., Валеру Д., Вользе Я., Л.Г., В.М., Ніне А., Л.К., Кацярыне П., Казімеру Г., Ніне К., Н.Р., Сьвятлане Р., У.С., А.П., А.Б., Ільлі А., С.М.** зь Менску.

Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакозу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 21.05.2008.
Замова № 2685.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.